

СТУДАТРАД – ДОБРЫ БОНУС У ЖЫЦЦІ

ЧЫРВОНКА

БЕСПАКАРАНАСЦЬ СПАРАДЖАЕ ЎСЁДАЗВОЛЕНАСЦЬ

12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ВЕРАСНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 188 (30322)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Рыгор ШЛЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«На адным з нядаўніх мерапрыемстваў Прэзідэнт Беларусі зазначыў, што ў дзейнасці ўсіх кіраўнікоў — ад рэгіёнаў і мясцовай вертыкалі да цэнтральнага звяна — у прыярытэце павінна быць работа з людзьмі. Такія падыходы не з'яўляюцца нечым новым, паколькі кіраўнік дзяржавы ўдзяляе пільную ўвагу рабоце са зваротамі грамадзян з самага пачатку прэзідэнцкага тэрміну. Актуальнасць работы з насельніцтвам, зваротамі грамадзян і, самае галоўнае, эфектыўнасць гэтай работы пацвярджаецца статыстыкай. Так, за 8 месяцаў 2024 года ў Адміністрацыю Прэзідэнта паступіла каля 12 тысяч зваротаў, што ў цэлым адпавядае ўзроўню аналагічнага леташняга перыяду. Адным з найбольш эфектыўных метадаў работы са зваротамі з'яўляецца асабісты прыём грамадзян. Так, на працягу года прыёмную наведвае ў сярэднім каля 4 тысяч грамадзян, за дзень — ад 10 да 20 чалавек».*

## КОРАТКА

- **Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху правядзе Дзяржаўтаінспекцыя 27 верасня.**
- Беларуская чыгунка адкрыла продаж білетаў на дадатковую «Ластаўку» паміж Мінскам і Масквой, якая будзе курсіраваць з 1 лістапада.
- **Грамадзянам Беларусі рэкамендавана пакінуць Ліван.**
- На сёння ў Беларусі больш за 1,5 млн, або каля 17 %, грамадзян ва ўзросце 65+.

# ПАЧАСТУНКІ — ЯК У КАЗЦЫ



Дзіцячы сад № 42 горада Мазыра пад назвай «Лясная казка» вядомы сваёй цікавай гісторыяй. Раней на гэтым месцы была і ваенная часць, і аўдыторыі педагагічнага ўніверсітэта, цяпер жа кожны дзень чуецца дзіцячы смех. А яшчэ тут вельмі смачнае чатырохразовае харчаванне.

На фота: повар Алена МАРОЧКА рыхтуе зразы на вячэру.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

Увасабленне

## Знайсці сілу, адчуць самабытнасць...

### дазволіць усім рэспубліканская грамадска-культурная акцыя «Марафон адзінства»



Фота БелТА.

СТАР. 3

Прыярытэты

## Два ў адным

### У Мінпраме адзначылі, што Расія для нас з'яўляецца не проста асноўным рынкам збыту, а магутным пляцоўкай тэхналагічнай кааперацыі

**Як распавёў першы намеснік міністра прамысловасці Аляксандр АГАРОДНІКАЎ, сёлета ведамства адзначае сваё 30-годдзе. Многія прадпрыемствы маюць больш чым стагадовую гісторыю развіцця. Яны маюць уласныя прадукты, захавалі моцныя працоўныя калектывы і вызначаюць стратэгію далейшага развіцця.**

А яшчэ варта адзначыць, што ў агульным аб'ёме леташняга экспарту прадпрыемстваў сістэмы Міністэрства прамысловасці 80 % склала навукаёмістая і высокатэхналагічная прадукцыя, сказаў Аляксандр Агароднікаў. Ён заўважыў, што беларускія машыны сёння працуюць ва ўсіх частках нашай планеты. На дадзеным этапе прадукцыя прадпрыемстваў сістэмы Мінпрама пастаўляецца прыкладна ў 150 краін свету. Акрамя таго, з 2016 года аб'ём прамысловай вытворчасці вырас у паўтара раза ў супастаўных умовах, а экспарт за апошнія дзве пяцігодкі павялічыўся больш чым у два разы.

СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2024 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

Парламенцкі дзённік

# СПРОШЧАНАЕ БУДАЎНІЦТВА, АБНАЎЛЕННЕ ТРАНСПАРТНАГА ПАРКА І СТАПРАЦЭНТНАЕ ЯКАСНАЕ ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННЕ

## Анатоль СІВАК — аб перспектывах развіцця будаўнічага і транспартнага комплексаў краіны, жыллёва-камунальнай гаспадаркі

**З адпаведным дакладам намеснік прэм'ер-міністра выступіў на сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, пасля чаго адказаў на пытанні парламентарыяў. Паляпшэнне жыллёвых умоў, транспартнае забеспячэнне заўсёды знаходзяцца ў топе праблем, з якімі да дэпутатаў і сенатараў звяртаюцца грамадзяне. Аднымі з найбольш вострых і актуальных для насельніцтва таксама з'яўляюцца пытанні, звязаныя з эксплуатацыяй жыллёвага фонду, правядзеннем бягучага і капітальнага рамонтаў.**

### Будаўнічы комплекс

За восем месяцаў 2024 года на выкананне будаўніча-мантажных работ накіравана 12 млрд рублёў, што ў супастаўных цэнах складае 105,2 % да ўзроўню мінулага года. Аб'ём работ па капітальным рамонце падраднымі арганізацыямі склаў 1,2 млрд рублёў, тэмпы росту да ўзроўню мінулага года — 102,4 %, па бягучым рамонце — 2,3 млрд рублёў (128,1 %). Падраднымі арганізацыямі краіны за сем месяцаў бягучага года забяспечана прыбытковая і рэнтабельная работа.

Што датычыцца заработнай платы будаўнікоў, за студзень — ліпень гэтага года яна склала 2,5 тысячы рублёў і перавысіла сярэднерэспубліканскі ўзровень на 14,1 %. «У параўнанні з іншымі відамі дзейнасці па ўзроўні заработнай платы будгаліна займае пятае месца, а тэмпах росту налічанай сярэднямесячнай заработнай платы па выніках студзеня — ліпеня 2024 года — першае месца сярод іншых галін», — адзначыў Анатоль Сівак.

Па словах віцэ-прэм'ера, тэмпы экспарту будаўнічых, інжынерных і архітэктурных паслуг склалі 104,2 %. «Дадатнае знешнегандлёвае сальда ўпершыню дасягнула памеру 223,6 млн долараў, — звярнуў увагу ён. — Гэтаму спрые работа па актыўным выхадзе беларускіх падрадных арганізацый на рынкі расійскіх рэгіёнаў, якая праводзіцца ва ўзаемадзеянні з урадам Расійскай Федэрацыі».

Аб'ём вытворчасці прамысловасці будматэрыялаў па краіне за восем месяцаў у цэлым склаў 4,8 млрд рублёў і вырас у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 6 %. «Адным з галоўных складнікаў устойлівага развіцця вытворчасцяў будаўнічых матэрыялаў па-ранейшаму застаецца падтрыманне высокага ўзроўню якасці гатовай прадукцыі, яе канкурэнтаздольнасці, — падкрэсліў Анатоль Сівак. — Прыярытэтам у доўгатэрміновай перспектыве для айчынных прадпрыемстваў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў становіцца пытанне павелічэння глыбіні перапрацоўкі мясцовых сыравінных рэсурсаў і арганізацыя здабычы будаўнічых карысных выкапняў узамен імпартнай сыравіны».

За восем месяцаў бягучага года ў эксплуатацыю ўведзена 2,2 млн кв. метраў жылля. Найбольш высокія паказчыкі па Брэсцкай і Віцебскай абласцях, самы нізкі паказчык — па Мінску. «Гадавое заданне па будаўніцтве жылля з дзяржаўнай падтрымкай выканана на 32,9 %, увод склаў 460 тысяч кв. метраў, — канкрэтызаваў намеснік прэм'ер-міністра. — Доля індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва ў агульным аб'ёме ўведзенага ў эксплуатацыю жылля склала 53,1 %. Забяспечанасць насельніцтва жыллём паводле вынікаў 2023 года склала 29,9 кв. метра на чалавека, што перавышае ўстаноўлены ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады паказчык».

Анатоль Сівак нагадаў, што ў бягучым годзе кіраўніком дзяржавы зададзены прынцыпова новы вектар у жыллёвай палітыцы — аказанне дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве жылля перш за ўсё там, дзе ствараюцца і развіваюцца вытворчыя магутнасці. З мэтай яго рэалізацыі ўжо прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 344 «Аб субсідзіраванні юрыдычных асоб пры ўзвядзенні або набыцці жылых памяшканняў», якім прадугледжваецца выдзяленне дзяржаўным арганізацыям субсідый з бюджэту ў памеры 50 % стаўкі рэфінансавання для кампенсацыі працэнтных ставак па крэдытах, прыцягнутых гэтымі арганізацыямі для будаўніцтва (набыцця) арэнднага жылля. Пры гэтым кожнае пятае такое арэнднае памяшканне падлягае прадастаўленню ў першачарговым парадку маладым спецыялістам і моладзі ва ўзросце да 31 года.

Урадам распрацоўваецца адзін нарматыўны акт, дзе будуць замацаваны ўсе формы дзяржаўнай падтрымкі грамадзян. Палажэнні гэтага акта будуць выкладзены простай і зразумелай мовай. «Гэта патрабаванне кіраўніка дзяржавы, — падкрэсліў Анатоль Сівак. — Для спрашчэння працэсу будаўніцтва жылля цяпер прапрацоўваецца пытанне замацавання парадку, пры якім будучыя ўласнікі жылля (юрыдычныя і фізічныя асобы) максімальна выключаюцца з працэсу будаўніцтва і будуць купляць у асноўным ужо гатовае жыллё. Гэта дазволіць, на наш погляд, пазбегнуць у далейшым цэлага шэрагу праблемных пытанняў, што ўзнікаюць у фізічных асоб, якія не валодаюць дастатковымі ведамі ў галіне будаўніцтва».

Адносна індывідуальнага жылля падрыхтаваны праект указа, які прадугледжвае стварэнне спрошчанага парадку ўзвядзення будаўнічымі арганізацыямі жылых дамоў з наступнай іх рэалізацыяй насельніцтву, а таксама падключэння індывідуальных жылых дамоў да інжынерных сетак эксплуатацыйнымі арганізацыямі па заяўках грамадзян і юрыдычных асоб. У мэтах стымулявання попыту з боку насельніцтва ўрадам прынята рашэнне аб аказанні падтрымкі фізічным асобам у выглядзе льготнага крэдытавання пад 4 % гадавых пры набыцці камплектаў драўляных аднакватэрных жылых дамоў, якія вырабляюцца лясгасамі.

«У цэлым, калі казаць пра асноўныя напрамкі ў жыллёвай палітыцы, плануецца спрашчэнне для юрыдычных і фізічных асоб працэсу будаўніцтва і набыцця жылля, рэнавацыя існуючых жылых тэрыторый населеных пунктаў, стварэнне ўмоў для прыцягнення людзей у сельскую мясцовасць і замацавання кадраў запатрабаваных спецыяльнасцяў на рабочых месцах, уключэння ў абарот пустога жылля і павышэння ўзроўню яго добраўпарадкавання», — падсумаваў гэты блок пытанняў Анатоль Сівак.

### Транспартны комплекс

Сітуацыя ў сферы грузавых перавозак па-ранейшаму характарызуецца пераарыентацыяй беларускіх экспартных грузаў на ўсходні напрамак і скарачэннем аб'ёмаў транзіту грузаў у напрамку Усход — Захад — Усход. «Станоўчую дынаміку дэманструюць практычна ўсе віды транспарту, у лідарах — аўтамабільны транспарт, — удакладніў віцэ-прэм'ер. — Урадам прымаюцца меры, накіраваныя на павелічэнне патэнцыялу транспартнага комплексу як для павышэння правазных магчымасцяў, так і якаснага складніка. Тут адным з найважнейшых фактараў з'яўляецца рэалізацыя інвестыцыйных праграм».

Ідзе закупка рухомага саставу беларускіх вытворцаў. Усяго ў 2024 годзе стаіць задача набыць не менш як 2700 адзінак грузавога чыгуначнага рухомага саставу. Ужо закуплена 1510 вагонаў. Па словах намесніка прэм'ер-міністра, актуальным з'яўляецца пытанне абнаўлення парка рухомага саставу пасажырскага аўтамабільнага і гарадскога электрычнага транспарту. «Сёлета плануецца набыць больш за 740 адзінак рухомага саставу, у тым ліку больш за 600 аўтобусаў, 90 тралейбусаў, 30 электробусаў і 22 трамваі. За мінулы перыяд года ўжо набыта 317 адзінак», — канкрэтызаваў ён.

Другім найважнейшым напрамкам укладання інвестыцый з'яўляецца інфраструктура. У чыгуначнай сферы працягваюцца работы па аднаўленні і развіцці ўчастка 9-га транспартнага калідора (Жлобін — Магілёў — Орша — Віцебск — Езярышча). Работы плануецца завяршыць да 2026 г. Для перавозкі экспартна-імпартных грузаў у парты Паўночнага Захаду аўтамабільным транспартам, павышэння эфектыўнасці гэтых перавозак у лістападзе ўводзіцца ў эксплуатацыю ўчастак дарогі М-3 ад Лагойска да Плешчаніц, выкананай па 1-й катэгорыі, і дарога Р-46 на ўчастку ад Сарочына да Полацка, дзе вырашаецца галоўная праблема — павелічэнне нагрузкі на вось. Заканчваецца капітальны рамонт дарогі ад Полацка да граніцы з Расійскай Федэрацыяй.

«З улікам уступлення Рэспублікі Беларусь у Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва адкрываюцца вялікія перспектывы перад рэспублікай і транспартным комплексам, — акцэнтаваў увагу намеснік кіраўніка ўрада. — Ствараюцца ўмовы, якія садзейнічаюць павелічэнню аб'ёмаў гандлю, лічбавай трансфармацыі і павышэнню попыту на транспартныя і лагістычныя паслугі. Вядзецца работа, накіраваная на эфектыўную практычную рэалізацыю дасягнутых міжнародных дамоўленасцяў».

Актуальным з'яўляецца пытанне павышэння хуткасці і камфортнасці транспартных зносін з гарадамі-спадарожнікамі. Вырашэнне гэтага пытання плануецца забяспечыць за кошт змянення стану і параметраў дарог, прымянення запланаванага да закупкі сучаснага рухомага саставу. Рыхтуецца нарматыўны акт, накіраваны на паскарэнне развіцця праекта «гарадская электрычка».

«У сферы паветранага транспарту набліжаецца да ўступлення ў сілу міжурадавае Пагадненне з Расійскай Федэрацыяй аб спагнанні аэранавігацыйных і аэрапортавых збораў і тарыфаў, рэалізацыя якога дасць магчымасць забяспечыць роўныя тарыфныя ўмовы пры аказанні паслуг аэрапортаў і аэранавігацыйных паслуг эксплуатантам паветраных суднаў абедзвюх дзяржаў, — дадаў Анатоль Сівак. — Флот пасажырскіх паветраных суднаў авіякампаніі «Белавія» цяпер максімальна задзейнічаны па ўсіх адкрытых напрамках. Працягваецца работа па развіцці ўсходняга і паўднёвага напрамкаў палётаў для ажыццяўлення рэгулярных паветраных пасажырскіх перавозак. Рэгулярныя рэйсы выконваюцца ў 22 аэрапорты 10 дзяржаў».

Актыўна ажыццяўляецца працэс узвядзення, рэканструкцыі і рамонту аўтамабільных дарог агульнага карыстання, на што накіравана 2,2 млрд рублёў. За мінулы перыяд гэтага года ўжо адрамантавана 4369 км аўтадарог агульнага карыстання, у тым ліку 1624 км рэспубліканскіх і 2745 км мясцовых аўтадарог, што перавышае першапачатковыя планы. Актыўна рамантуюцца маставыя збудаванні.

### Жыллёва-камунальная гаспадарка

Штогод нарошчваюцца аб'ёмы капітальнага рамонту жылля. У 2023 годзе капітальна адрамантавана 3454,8 тысячы кв. метраў жылля. Як адзначыў віцэ-прэм'ер, гэта самы высокі паказчык за ўвесь час. У 2024 годзе запланавана капітальна адрамантаваць 3667,4 тысячы кв. метраў жылля.

«Сёлета фінансаванне капітальнага рамонту жылля на 62 % ажыццяўляецца за кошт бюджэту і толькі на 38 % за кошт сродкаў насельніцтва, — канкрэтызаваў ён. — Пры гэтым доля ўдзелу насельніцтва ў фінансаванні капітальнага рамонту скарацілася за год на тры працэнтныя пункты. Працягваецца планамерная работа па замене ў шматкватэрных жылых дамах ліфтаў, якія адпрацавалі нарматыўныя тэрміны эксплуатацыі. Цяпер у жыллёвым фондзе практычна няма ліфтаў, якія эксплуатуюцца звыш нарматыўных тэрмінаў».

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы ўрадам, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прыняты дадатковыя меры па прывядзенні ў належны стан дваровых тэрыторый у населеных пунктах з прыцягненнем грамадзян. «У 2024 годзе па выніках інвентарызацыі вуліц 1421 аграгарадка аблвыканкамамі сфарміраваны рэгіянальныя праграмы рамонту вулічна-дарожнай сеткі ў аграгарадках на 2024—2025 гады і на перыяд да 2030 года, — расказаў віцэ-прэм'ер. — Сфарміраваны комплекс мер, накіраваны на паляпшэнне эксплуатацыі ўсёй вулічнай сеткі. У аснове яго ляжыць скарачэнне аб'ёмаў будаўніцтва новых вуліц, а таксама вывад з эксплуатацыі тых вуліц, дзе адсутнічаюць будынкі, што эксплуатуюцца. На 1 верасня 2024 года адрамантавана 241 вуліца ў 84 аграгарадках агульнай плошчай 709,4 тыс. кв. метраў».

Аблвыканкамамі сфарміраваны рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў для рэалізацыі пастаўленай кіраўніком дзяржавы задачы па забеспячэнні ў 2025 годзе ўсіх спажыўцоў якаснай пітной вадой. «На 1 верасня 2024 года ўведзены ў эксплуатацыю 84 станцыі абезжалезвання вады, яшчэ на 42 станцыях вядуцца будаўніча-мантажныя работы, для будаўніцтва 24 станцый ажыццяўляецца падрыхтоўка пляцовак, — паведаміў віцэ-прэм'ер. — Знаходзіцца на экспертызе ці завяршаецца распрацоўка праектнай дакументацыі на будаўніцтва 29 станцый. Перападключаны да існуючых цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння з вадой нарматыўнай якасці сем населеных пунктаў з васьмі запланаваных. У рамках забеспячэння пераводу ў 2025 годзе Мінска на водазабеспячэнне з падземных крыніц у цяперашні час па ўсіх чатырох чэргах будаўніцтва вядуцца будаўніча-мантажныя работы. У выніку мер, што прымаюцца па выніках 2024 года, чакаецца выкананне мэтавага паказчыка па забяспечанасці спажыўцоў водазабеспячэннем пітной якасці на ўзроўні 99,1 %».

У сферы абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі (ЦКА), па словах намесніка прэм'ер-міністра, галоўная задача — мінімізаваць аб'ёмы іх захавання. Меры, што прымаюцца ў гэтым кірунку, далі магчымасць дасягнуць устойлівай дынамікі росту ўзроўню выкарыстання ЦКА, які з 2017 да 2023 года павялічыўся больш як у два разы. Працягваецца будаўніцтва рэгіянальных аб'ектаў па сартаванні і выкарыстанні ЦКА.

«Па адзіным кароткім нумары 115 і праз інтэрнэт-партал 115. бел ад насельніцтва краіны за студзень—жнівень 2024 года паступіла 1805 тысяч заявак і прэтэнзій на якасць жыллёва-камунальных паслуг: гэта на 9,3 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, — адзначыў Анатоль Сівак. — Статыстыка сведчыць, што, нягледзячы на меры, якія прымаюцца ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы, чакаецца вялікая работа па выпраўленні недахопаў, у тым ліку па інфармацыйнага ўзаемадзеяння з насельніцтвам, уключаючы асвятленне работы, якая праводзіцца ў галіне. Спадзяюся, што рост зваротаў звязаны і з ростам даверу да нізавых прадпрыемстваў. Людзі пачалі звяртацца на месцы, а не спрабаваць вырашыць свае часам шараговыя праблемы за кошт зваротаў у цэнтральны орган улады».

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

Як падкрэсліў у размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід ЗАЯЦ**, падчас сумеснага пасяджэння ўздымаліся актуальныя пытанні, якія патрабуюць асаблівых адносін і ўвагі з боку органаў дзяржаўнага кіравання. «Што датычыцца сяла, непакояць пытанні транспарту, — канкрэтызаваў ён. — Транспартныя сувязі — як дабрацца чалавеку з вёскі ў горад — выклікаюць пэўныя складанасці. І гэта праблема не аднаго чалавека, а цэлых населеных пунктаў, якія пазбаўлены магчымасці дабрацца ў горад. Мы ў Савеце Рэспублікі з удзелам Наталлі Качанавай з запрашэннем міністра транспарту і камунікацый абмяркоўвалі гэтыя пытанні. Што датычыцца пытанняў ЖКГ, мы бачым зацікаўленасць людзей. Пытанні прыборкі смецця, яго несвоечасовага вывазу, натуральна, павінны стаяць на кантролі ў кіраўніцтва ЖКГ. Лічу, што калі кожны на сваім працоўным месцы будзе па-дзяржаўнаму выконваць свае абавязкі, то гэтыя пытанні ў насельніцтва ўзнікаць не будуць. А калі яны ўзнікаюць, трэба імгненна прымаць рашэнні».

# Знайсці сілу, адчуць самабытнасць...

**На ўрачыстым мерапрыемстве да Дня народнага адзінства 17 верасня Прэзідэнт Беларусі аб'явіў аб старце рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства». Як сказаў кіраўнік дзяржавы, «гэта будзе марафон трыадзінства традыцый: нацыянальнай культуры, якую зберагаем і развіваем, талентаў нашых людзей, якімі славіцца наша зямля, прыгажосці славянскай душы, якая напаўняе свет навокал гармоніяй і ўзаемаразуменнем».**



Фота БелТА.

Сама ідэя падобнага мерапрыемства зарадзілася даволі даўно. Спачатку з падачы кіраўніка дзяржавы быў праведзены фестываль «Беларусь — мая песня», дзе шырокая аўдыторыя мела магчымасць убачыць таленты найлепшых рэгіянальных і абласных калектываў нашай краіны. Яны прэзентавалі сваю творчасць на адной з галоўных канцэртных пляцовак — у Палацы Рэспублікі. Не абмінуў увагай тыя канцэрты і Прэзідэнт, адзначаючы як адметных нумары, так і ўвогуле атмасферу і высокі прафесійны ўзровень праграм. Так паступова з'явілася яшчэ адна ідэя: сабраць найлепшае з гэтых канцэртаў і аб'яднаць у адзін агульны творчы праект.

І на сёння ў нас сфарміравана праграма мерапрыемстваў, якія пройдуць на агульнарэспубліканскім і на рэгіянальных узроўнях. Распрацаваны таксама графік «Марафону адзінства». У выглядзе канцэртаў і лакальных мерапрыемстваў ён даедзе ў кожны рэгіён Беларусі. Як правіла, гэта праграма будзе двухдзённай і прапануе наведвальнікам мерапрыемстваў розных кірункаў. Завяршаць яе плануем вялікім маштабным канцэртам, у якім, па нашай задумцы, таксама ёсць

— Падрыхтоўка ў нас вялася вельмі сур'ёзная і скрупулёзная. І галоўнае, лічу, што ў аснове ідэі ёсць душэўнасць, прыгажосць і самабытнасць кожнага рэгіёна. А прымалі ўдзел не толькі знаёмыя калектывы, але і тыя, хто сябе зарэкамендаваў па працягу ўсяго перыяду выступленняў на розных пляцоўках. Усе яны ўпрыгожылі дадзенае мерапрыемства, — адзначыў **міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль МАРКЕВІЧ.** — Таму разам з нашымі калегамі, з рэжысёрскай групай мы зрабілі ўсё, каб абудзіць у гледачах чарговы раз добры настрой, паказаць і наша гістарычнае мінулае, і тое, наколькі ў нас багатая культура, якія таленты мае наша краіна. І «Марафон адзінства» стаў такім яднальным мерапрыемствам для ўсёй Беларусі. Упэўнены, што мы зможам здзівіць аўдыторыю нашымі задумкамі ў кожным рэгіёне.

> **«Часта і шмат Прэзідэнт гаворыць пра тое, як мы павінны працаваць і наколькі важная цяпер праца кожнага з нас. Аднак у нашым жыцці ёсць месца і адпачынку, святу. І вельмі хочацца, каб такое свята ў выглядзе «Марафону адзінства» прыйшло ва ўсе рэгіёны нашай краіны».**

— Як мы разумеем, лепшай даты, чым 17 верасня, Дзень народнага адзінства, нельга было прыдумаць. Раней у гэты дзень мы рабілі ў канцэртах акцэнты на іншыя тэмы, а сёлета паказалі менавіта наша адзінства — творчае, духоўнае. Нумары былі вельмі розныя, але аб'яднаныя ў адно палатно. Канцэрт спадабаўся гледачам. Таму «Марафон адзінства» — лагічны і натуральны працяг. І ў кіраўніка дзяржавы, і ва ўсіх нас, арганізатараў, вялікае жаданне, каб гэты канцэрт, вядома, недзе трансфармаваны, у адаптаваным выглядзе ўбачыла ўся Беларусь, — адзначыла **прэс-сакратар Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля ЭЙСМАНТ.** — Часта і шмат Прэзідэнт гаворыць пра тое, як мы павінны працаваць і наколькі важная цяпер праца кожнага з нас. Аднак у нашым жыцці ёсць месца і адпачынку, святу. І вельмі хочацца, каб такое свята ў выглядзе «Марафону адзінства» прыйшло ва ўсе рэгіёны нашай краіны.

Па словах арганізатараў, каманда прафесіяналаў ужо даўно працуе над рэалізацыяй ідэі «Марафону адзінства» і на сёння ўжо складзена дарожная карта па правядзенні акцыі.

— Падрыхтоўка да правядзення акцыі пачалася задоўга да таго, як афіцыйна пра яе аб'явілі. Пачалі работу мы якраз па даручэнні Прэзідэнта і на працягу некалькіх месяцаў з розных галін і абласцей уносілі свае прапановы, на аснове чаго фарміравалі праграму мерапрыемстваў «Марафону адзінства», — падзялілася **кіраўнік рабочай групы па падрыхтоўцы акцыі «Марафон адзінства» Ганна ЛУКАШЭНКА.** — Разумеючы, што адзінства — гэта шматслойнае паняцце, мы напаўнялі нашу акцыю мерапрыемствамі, якія будуць аб'ядноўваць людзей праз культуру, праз адукацыю, нейкую агульную дзейнасць.

яднальны сэнс, паколькі на адной сцэне выступяць не толькі мясцовыя калектывы, але і артысты, запрошаныя з іншых рэгіёнаў і сталіцы.

Першым пунктам маршруту стане Маладзечна. Горад 11 і 12 кастрычніка будзе прымаць «Марафон адзінства». Усяго, па папярэдніх планах, акцыя ахопіць 13 населеных пунктаў Беларусі, у ліку якіх — абласныя гарады, а таксама Маладзечна, Жлобін, Бабруйск, Орша, Ліда, Салігорск, Баранавічы. Фінальных пунктаў правядзення «Марафону адзінства», як і канкрэтных часавых рамак, пакуль ніхто не называе, бо арыентавацца арганізатары будуць найперш на цікавасць і запыт з боку глядацкай аўдыторыі. У падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў акцыі «Марафон адзінства» задзейнічаны: Міністэрства культуры, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства спорту і турызму, Мінгарвыканкам, абласныя выканаўчыя камітэты, ТАА «Музычная медыякампанія», Палац Рэспублікі, БелТА, Федэрацыя прафсаюзаў, БРСМ, Белтэлерадыёкампанія, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Беларускае таварыства «Веды» і іншыя.

Маштабныя канцэрты з удзелам любімых і вядомых артыстаў пройдуць у розных гарадах нашай краіны і падораць шмат станоўчых эмоцый свайму гледачу. І падчас наступных канцэртаў гледачы змогуць атрымаць асалоду не толькі ад выступлення сваіх любімых мясцовых выканаўцаў, але і ад творчых нумароў, падрыхтаваных спецыяльна для «Марафона адзінства» ўдзельнікамі з іншых рэгіёнаў. Так, калі папярэдне падсумоўваць, то «Марафон адзінства» — гэта не толькі выдатная магчымасць прасякнуцца беларускай самабытнай культурай на канцэртнай пляцоўцы, але і прыняць удзел у шэрагу іншых па фармаце мерапрыемстваў, каб цікава было аўдыторыі розных узростаў і інтарэсаў. Адна з задач, якую ставяць перад сабой арганізатары, — выкарыстанне нестандартных рашэнняў па форме і змесце мерапрыемстваў, выкарыстанне разнастайных інтэрактываў. У прыватнасці, у рамках «Марафону адзінства» запланавана правядзенне адкрытага конкурсу малюнка вучняў пачатковых класаў «Мы разам», рэспубліканскі конкурс сачыненняў на тэму «Што такое адзінства», рэспубліканскі конкурс

> **Першым пунктам маршруту стане Маладзечна. Горад 11 і 12 кастрычніка будзе прымаць «Марафон адзінства». Усяго, па папярэдніх планах, акцыя ахопіць 13 населеных пунктаў Беларусі, у ліку якіх — абласныя гарады, а таксама Маладзечна, Жлобін, Бабруйск, Орша, Ліда, Салігорск, Баранавічы.**

Мерапрыемствы «Марафону адзінства» ў поўнай ступені ахопяць усю краіну. Маштабныя сустрэчы дазволяць беларусам убачыць усю палітру талентаў роднай зямлі і дакрануцца да багатай спадчыны нацыянальнай культуры. Плануюцца таксама мерапрыемствы з удзелам Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, паказы кінастужак «Беларусьфільма», дыялогавыя пляцоўкі.

праектаў «Мой уклад у будучыню краіны», серыя мерапрыемстваў у ССУА «Не сумная не лекцыя», серыя мерапрыемстваў «Знакавая сустрэча», стварэнне муралаў, гарадскія квэсты «Гэта ўсё маё роднае» і іншыя. Як адзначаюць арганізатары, ёсць імкненне зрабіць гэтую акцыю па-сапраўднаму маштабнай, ахапіць максімальна шырокую ўзроставую аўдыторыю.

**Алена ДРАПКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Заканатворчасць

# Матывацыя занятасці і сацыяльная абароненасць ваенных пенсіянераў

## Савет Рэспублікі адобрыў шэраг законапраектаў

**Сярод іх — «Аб змяненні законаў па пытаннях занятасці насельніцтва», «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях і органаў фінансавых расследаванняў» і «Аб акрэдытацыі ў Нацыянальнай сістэме акрэдытацыі Рэспублікі Беларусь».**

Праектам Закона «Аб змене законаў па пытаннях занятасці насельніцтва», у прыватнасці, скарачаецца перыяд знаходжання на ўліку беспрацоўных і грамадзян, якія звярнуліся па пытаннях працаўладкавання, — з 18 да 12 месяцаў. Устанаўліваецца фіксаваны памер дапамогі па беспрацоўі і ўводзяцца дадатковыя патрабаванні да яе атрымання. Уносяцца нормы аб парадку аказання садзейнічання занятасці бацькоў, якія абавязаны кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні. Удакладняюцца правы наймальнікаў па падачы звестак аб наяўнасці вакансій з выкарыстаннем Інфармацыйнага партала дзяржаўнай службы занятасці.

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА** адзначыла навізну і сучаснасць законапраекта аб занятасці. Навацыі прадстаўлены трыма блокамі. «Першы блок — матывацыйны: гэта змяненне статусу беспрацоўнага, перыяду выплаты дапамогі па беспрацоўі і ў прынцыпе перыяду часу, калі чалавек у нас можа быць беспрацоўным, — канкрэтызавала яна. — Другі блок я назвала б кірункам магчымасцяў: магчымасці закладзены як для наймальніка, так і для самога чалавека. Для наймальніка — сучасны інструмент падачы вакансій, для чалавека — электронная рэгістрацыя ў службах занятасці. Сёння зарэгістравацца беспрацоўным можна толькі па месцы прапіскі, мы прапаноўваем — па месцы знаходжання, каб у чалавека было больш магчымасцяў для атрымання паслуг службы занятасці».

Адкрываюцца новыя перспектывы для навучання і перанавучання грамадзян. У прыватнасці, прадугледжана бясплатнае навучанне мам, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Сёння такая магчымасць ёсць і для мам, якія выхоўваюць дзяцей да трох гадоў.

Трэці блок новаўвядзенняў звязаны з асобнымі падыходамі для асаблівых катэгорый. Напрыклад, прадугледжана кватаванне працоўных месцаў для інвалідаў, для асоб перадпенсіённага ўзросту, для тых, хто мае пэўныя залежнасці, прайшоў лячэнне і гатовы выйсці на рынак працы.

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргея СІЎЦА,** змяненні, якія прапаноўваюцца, у першую чаргу накіраваны на прадухіленне залежнасці беспрацоўных ад сацыяльных выплат і стымуляванне іх на пошук работы. «Замацаванне пэўных патрабаванняў да работадаўцаў па падачы інфармацыі аб вакансіях выключна ў электронным выглядзе з прыярытэтам на размяшчэнне ў Агульнарэспубліканскім банку вакансій накіравана на спрашчэнне і паскарэнне працэсу пошуку работы, — дапоўніў сенатар. — Гэтыя і іншыя змяненні будуць садзейнічаць далейшаму развіццю і ўдасканаленню работы органаў дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва, якая адпавядае патрабаванням сённяшняга дня».

Праектам Закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях і органаў фінансавых расследаванняў» прадугледжаны працяг выплаты пенсій ваенным пенсіянерам дзяржаў — удзельніц міжнародных дагавораў, а таксама членам іх сем'яў, пенсіі, якім іх прызначаны ў Беларусі да іх выезду нашай краіны з гэтых дагавораў. Даецца права на прызначэнне пенсій прыбылым для пастаяннага пражывання ў нашу краіну з дзяржаў — удзельніц міжнародных дагавораў ваенным пенсіянерам, раней звольненым з ваеннай службы (службы) у СССР або Рэспубліцы Беларусь, а таксама членам іх сем'яў пры ўмове спынення ім выплаты аналагічных відаў пенсіі па ранейшым месцы жыхарства. Пенсія будзе налічвацца і ваенным пенсіянерам, раней звольненым з ваеннай службы ў СССР або Рэспубліцы Беларусь, а таксама членам іх сем'яў пры іх выездзе для пастаяннага пражывання за межы нашай краіны ў дзяржавы — удзельніцы міжнародных дагавораў.

Як звярнуў увагу **міністр абароны Віктар ХРЭНІН,** гэтыя змяненні дазваляюць захаваць узровень сацыяльнай абароненасці ваенных пенсіянераў і членаў іх сем'яў, які існуе ў цяперашні час, павялічыць памеры павышэння пенсій ваенным пенсіянерам і членам іх сем'яў. Пры гэтым нормы, якія прапаноўваюцца, па яго словах, прывядуць да эканоміі бюджэтных сродкаў, якія накіроўваюцца на пенсіённае забеспячэнне.

Сярод новаўвядзенняў законапраекта «Аб акрэдытацыі ў Нацыянальнай сістэме акрэдытацыі Рэспублікі Беларусь» — устанаўленне парадку правядзення акрэдытацыі, прыняцця адпаведнага рашэння, абскарджання такіх рашэнняў, а таксама парадку пазапланавай ацэнкі кампетэнтнасці. Замацоўваюцца прававыя аспекты фарміравання, вядзення і тэхнічнага суправаджэння Адзінай інфармацыйнай сістэмы ў сферы акрэдытацыі і іншае.

**Вераніка КАНЮТА.**

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць у рэгіёнах

# БЯСПЕКА І СТАБІЛЬНАСЦЬ — ГАЛОЎНЫ ПАРАДАК ДНЯ

### Што абмяркоўвае дэпутат парламента з выбаршчыкамі

**Міхаіл АКСЯНЮК, як і ўвесь дэпутацкі корпус Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі восьмага склікання, прыступіў да сваіх абавязкаў у красавіку 2024 года. За гэты час правеў нямала сустрэч і прыёмаў грамадзян у 49-й Гродзенскай-Занёманскай выбарчай акрузе. Вялікае значэнне дэпутат таксама надае дыялогу з маладым пакаленнем.**



Напрыклад, днямі Міхаіл Аксянюк пабываў у сярэдняй школе № 3 імя В. Усава і Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна Гродна. Тэма гутаркі актуальная — гістарычныя перадумовы аб'яднання заходніх абласцей Беларусі з БССР, значэнне Дня народнага адзінства. Дыялогавая пляцоўка на такую ж тэму адбылася з педагагічным калектывам Рацідкай сярэдняй школы Гродзенскага раёна.

Для парламентарыя гэта тэма блізкая і па родзе яго прафесійнай дзейнасці. Як прадстаўнік пагранічнага ведамства і член парламенцкай Камісіі па нацыянальнай бяспецы, ён імкнецца данесці да сваіх суразмоўцаў аспекты новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, якая была прынята сёлета на Усебеларускім народным сходзе. Вядзецца работа па прывядзенні нарматыўных актаў у адпаведнасць з гэтымі дакументамі.

— Многія не ведаюць, для чаго гэта робіцца, таму важна патлумачыць гэты момант, — зазначыў дэпутат. — Папярэдняя канцэпцыя дзейнічала з 2010 года, але за гэты час многае змянілася. Тое, што раней было здавальняльным, цяпер такім не з'яўляецца, узнікла патрэба прывесці ў адпаведнасць з існуючымі рэаліямі і нашу сукупнасць афіцыйных поглядаў на бяспеку. Таму канцэпцыя была перапрацавана. Калі, напрыклад, раней мы гаварылі аб нейкім нейтралітэце, сёння разумеем, што нейтральная дзяржава ў такім супрацьстаянні проста не выжыве. Таму неабходна быць у саюзе з аднадумцамі.

У сваіх выступленнях народны абраннік робіць акцэнт на міралюбівай палітыцы дзяржавы. Нягледзячы на тую абстаноўку, якая складваецца вакол беларускай дзяржавы, гаворка ідзе не аб канкрэтным, а пакуль што віртуальным праціўніку. Тым самым адзначаецца, што беларусы — мірныя людзі, якія не хочуць ваяваць, гатовы ісці на супрацоўніцтва. Але гэта не значыць, што яны не змогуць пастаяць за сябе і даць адпор.

— Не сакрэт, што мы прыводзім вучэнні, тактычныя дзеянні, вядзём пераўзбраенне, павышаем боегатоўнасць нашых часцей, рыхтуемся да самых крытычных сітуацый. І хаця мы не збіраемся ваяваць, але гатовы даць адпор кожнаму, хто са зброяй пераступіць нашу граніцу. Армія валодае сучаснай тактыкай бою, нават па ацэнках НАТА мы ўваходзім у пяцёрку краін Еўропы па ўзбраенні. Але да апошняга будзем трымацца за мірную ініцыятыву. Аб гэтым гаворыць і кіраўнік дзяржавы, і прадстаўнікі сілавых структур. Бо наша ваенная дактрына не наступальная, а абаранляльная, — патлумачыў парламентарый.

У сустрэчах з насельніцтвам дэпутату дапамагае яго багаты вопыт ідэалагічнага работніка. Напярэдадні выбарчай кампаніі Міхаіл Аксянюк быў начальнікам упраўлення ідэалагічнай работы Дзяржпагранкамітэта Беларусі. Ёсць у яго і вопыт дэпутацкай дзейнасці. Яшчэ на пачатку службы начальнікам заставы быў абраны дэпутатам сельскага Савета ў Пружанскім раёне. Было гэта ў 1990-я гады. Ужо тады прыйшло разуменне важнасці місіі дэпутата. Цяпер, калі яго акруга налічвае больш за 50 тысяч выбаршчыкаў, асоба народнага абранніка становіцца яшчэ больш значнай.

— Дэпутат парламента — гэта сіла, здольная паўплываць на настрой грамадства не толькі праз асабістыя кантакты, але ў большай ступені праз заканадаўчыя акты. Такім чынам можна вырашыць не адну, а цэлы шэраг праблем, якія наспелі ў грамадстве і маюць больш за ўсё зваротаў. І галоўнае тут — захаваць баланс інтарэсаў чалавека, грамадства і дзяржавы. Закон павінен урэгуляваць сітуацыю такім чынам, каб гэта было выгадна і дзяржаве, якая падтрымлівае парадак у краіне, і людзям, якія тут пражываюць, — фармулюе сваю пазіцыю дэпутат.

У сённяшніх рэаліях варта звяртаць увагу на развіццё новых тэхналогій, інавацыйныя праекты. Краіна не стаіць на месцы. І роля парламента — садзейнічаць гэтым крокам. У гэтым сэнсе дэпутат прыводзіць прыклад ратыфікацыі парламентам пагаднення паміж беларускім і расійскім бакамі аб адкрыцці ў Беларусі вытворчасці мнагамэтавага самалёта. Рашэнне аб гэтым прынята падчас чарговай сесіі Нацыянальнага сходу Беларусі.

— Ці думалі мы гадоў 30 таму, што такое ў нас магчыма? Ці тое, што беларус паляціць у космас? Але так адбылося. Мы не думалі, што ў нас будзе ўласная вытворчасць легкавых аўтамабіляў, а цяпер гэта ёсць. І сёння мы знаходзімся на тым этапе, што хутка станем краінай самалётабудавання. Пачынаем з невялікага на 19 месцаў, але перспектывы ў гэтым вялікія, — упэўнены суразмоўца.

Дэпутат надае вялікае значэнне сустрэчам з моладдзю, патрыятычнаму выхаванню. Яго галоўны пасыл — згуртаванасць, любоў да сваёй Радзімы, стваральная праца ў імя стабільнасці і міру ў Беларусі.

Не застаюцца ўбаку і праблемы негатыўнага інфармацыйна-псіхалагічнага ўздзеяння на моладзь. Аб гэтым, напрыклад, ішла гаворка падчас сустрэчы з ваеннаслужачымі інжынернай брыгады. Дэпутат звяртае ўвагу на выклікі сучаснасці, з якімі цяпер сутыкаецца моладзь, у прыватнасці, як пазбавіцца альбо скарацiць іх негатыўны ўплыў.

— Трэба чытаць рознабаковую інфармацыю, быць уважлівым. Навіны варта абмяркоўваць з кімсьці, менш траціць часу на карыстанне гаджэтамі. Важна сфарміраваць у сябе ўстойлівасць да інфармацыйнага ўздзеяння. Чаму ў нас забаронены доступ да дэструктыўных каналаў? Таму што там няма пазітыву. І такім чынам дзяржава абараняе сваіх грамадзян ад негатыўнай дэструктыўнай інфармацыі, — заўважае Міхаіл Пятровіч.

Сустрэчы з насельніцтвам — толькі частка той дзейнасці, якую ажыццяўляе дэпутат падчас работы ў акрузе. Людзі прыходзяць на асабістыя прыёмы, тэлефануюць падчас прамых ліній. Звяртаюцца таксама ў пісьмовай форме. У якасці зваротаў былі разгледжаны пытанні выплаты аднаразовай дапамогі падчас звальнення, забароны вэйпаў, выхавання падрастаючага пакалення, а таксама кантроль за дзейнасцю экскурсаводаў. Была вызначана і праблема догляду месцаў пахавання ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія не маюць родных. Усе гэтыя і іншыя пытанні, якія паступілі да дэпутата, узяты на кантроль і будуць вырашацца з улікам інтарэсаў грамадзян.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з архіва дэпутата.**

# ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ МАТЫВУЕ

**Графік заўсёды насычаны, але ад людзей зараджаешся... Асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, выязныя сустрэчы з выбаршчыкамі, наведванне сацыяльна значных аб'ектаў — аб насычаным графіку работы ў выбарчай акрузе «Звязда» распытала дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Андрэя БАЛЫША. Для Андрэя Іванавіча верасень у яго Гарадоцкай выбарчай акрузе № 21 выдаўся багатым на сустрэчы і разнастайныя мерапрыемствы.**

— Атрымаўся сапраўды жывы дыялог. Мяне цікавіла, напрыклад, як нашы маладыя спецыялісты прыйшлі ў прафесію. Дзяліліся сваім бачаннем, чаму цяпер здараецца, што моладзь вучыцца, атрымлівае дыплом, а потым у прафесіі іх не знайсці. Калі паразмаўляў з маладымі спецыялістамі-педагогамі, якія прыехалі на першае месца працы нехта ў горад, нехта ў сельскую мясцовасць, па тым, як яны матываваныя і сур'ёзна настроены, відаць, што застануцца ў прафесіі. Для сябе зазначыў, што сёння і ўлады на месцах, і ўласна працоўныя калектывы імкнуцца не толькі забяспечыць добрыя ўмовы працы, пражывання для маладых спецыялістаў, але і зрабіць усё магчымае, каб моладзі было цікава працаваць, раскрыцца, — дзеліцца сваімі назіраннямі парламентарый.



Зона адказнасці парламентарыя — Віцебскі, Гарадоцкі, а таксама частка Чыгуначнага раёна Віцебска ў межах былога гарадскога пасёлка Руба і Вярхоўе. Чакалі асабістай сустрэчы з Андрэем Балышам гэтым разам жыхары некалькіх населеных пунктаў.

— Частку мерапрыемстваў правяў у фармаце інфармацыйных груп. Шчыра прызнацца, знаходжуся пад вельмі добрым уражаннем ад мерапрыемстваў, якія прайшлі на базе Мазалаўскай сярэдняй школы і сярэдняй школы № 2 горада Гарадок, — адзначае Андрэй Іванавіч. — Сустрэчы выйшлі вельмі прадукцыйныя і цікавыя. Школьнікі задавалі настолькі ўдумлівыя, не па-дзіцячы сур'ёзныя пытанні, што, калі б не досвед жыццёвы, досвед як кіраўніка, было б нават складана з ходу адказаць. Вучні старэйшых класаў цікавіліся маім жыццёвым і працоўным шляхамі. Ім было цікава дазнацца, як пасля вучобы ў Беларускай дзяржаўнай сельгасакадэміі, аспірантуры ў Навукова-практычным цэнтры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве, працы кіраўніком у навуковых установах я прыйшоў да дэпутацкай дзейнасці. З майго вопыту сустрэч з выбаршчыкамі магу сказаць, што і на сустрэчах са школьнікамі, і ў працоўных калектывах, і на вытворчасці людзям цікава даведацца пра дзейнасць парламентарыяў. Дзялюся, якія задачы для сябе стаўлю ў рабоце ў выбарчай акрузе, расказваю аб дзейнасці нашай камісіі па аграрнай палітыцы.

Падчас работы ў верасні ў выбарчай акрузе вельмі цікавай і плённай атрымалася сустрэча парламентарыя з маладымі спецыялістамі-педагогамі, якія толькі прыйшлі на сваё першае месца працы або ўжо адпрацавалі першы год па спецыяльнасці. Мерапрыемства арганізавалі на базе сярэдняй школы № 2 Гарадка.

Гарадок і Гарадоцкі раён для Андрэя Іванавіча — мясціны асаблівыя. У свой час ён, ураджэнец Гродзеншчыны, менавіта сюды быў размеркаваны маладым спецыялістам.

— Падчас работы гэтым разам у выбарчай акрузе з радасцю прыняў удзел у гонар 100-годдзя ўтварэння Гарадоцкага раёна. Рады, што была магчымасць далучыцца да мерапрыемстваў, прысвечаных Дню народнага адзінства, — зазначае парламентарый. — Дарэчы, калі прымаў удзел у святочных мерапрыемствах і да Дня ведаў, і да Дня народнага адзінства, пераканаўся, як за душу бярэ, нікога не пакідае раўнадушным, калі дзеці — ад першакласнік да выпускнікоў — ведаюць на памяць, стараюцца, спяваюць гімн краіны. Гэта сведчыць аб тым, што і ідэалогія правільна працуе, і патрыятычнае выхаванне ў нас вельмі дастойнае.

Як падзяліўся парламентарый, на святочных мерапрыемствах, сустрэчах, дзе толькі апошнім часам ён быў госцем, пераважная большасць — ад дзяцей-школьнікаў да моладзі, учарашніх выпускнікоў ВНУ, а цяпер спецыялістаў-пачаткоўцаў, — глыбока ў тэме тых агульнадзяржаўных, ідэалагічных, палітычных задач, якімі жыве наша краіна, грамадзянская супольнасць.

— Мяне перапаўняў гонар, што ў нас такія адукаваныя, неабыякавыя, актыўныя людзі. Падчас правядзення інфармацыйных груп, адказваючы на пытанні нашых працаўнікоў, моладзі, пераканаўся: нашы людзі цэняць, што мы жывём шчасліва і бяспечна, жывём у суверэннай дзяржаве з развітой эканомікай, высокім узроўнем сацыяльнай абароны, — рэзюмуе парламентарый.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# «КІТАЙ І БЕЛАРУСЬ — ДОБРЫЯ СЯБРЫ І ДОБРЫЯ ПАРТНЁРЫ»



**Кітайская мадэрнізацыя ідзе па шляху мірнага развіцця. Гэтую станоўчую тэндэнцыю адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Чжан Вэньчуань на ўрачыстым прыёме з нагоды 75-й гадавіны з дня ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі.**

«Нягледзячы на тое, што я ўступіў на пасаду ўсяго некалькі дзён назад, мне ўжо ўдалося паўдзельнічаць у некалькіх мерапрыемствах, дзе мы правялі адкрыты і паглыблены абмен думкамі, — паведаміў кіраўнік дыпмісіі. — Я адчуў шчырыя і сяброўскія пачуцці ўсіх колаў беларускага грамадства ў адносінах да Кітая і іх вялікія чаканні па развіцці дружбы і супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі».

Як вядома, 1 кастрычніка адзначаецца 75-годдзе з дня ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі. «За гэтыя гады Кітай пад кіраўніцтвам Кампартыі прайшоў вялікі шлях, ператварыўся з беднай і адсталай краіны ў сярэднезаможнае грамадства, што стварыла рэдкія ва ўсім свеце цуды хуткага эканамічнага развіцця і доўгатэрміновай сацыяльнай стабільнасці. За больш чым 40 гадоў пасля пачатку правядзення палітыкі рэформ і адкрытасці сярэднегадавы рост эканомікі Кітая склаў 8,9 працэнта, а ўклад у сусветны эканамічны рост перавысіў 30 працэнтаў, — падкрэсліў Чжан Вэньчуань. — Пачынаючы з XVIII Усекітайскага з'езда КПК у 2012 годзе, Цэнтральны камітэт партыі, ядром якога з'яўляецца Сі Цзіньпін, аб'яднаў і ўзначаліў шматнацыянальны народ краіны для паспяховага прасоўвання і пашырэння кітайскай мадэрнізацыі».

2024-ы з'яўляецца вырашальным годам для Кітая ў дасягненні мэт і задач 14-га пяцігадовага плана. Ва ўмовах запаволення тэмпаў росту сусветнай эканомікі і павелічэння фактараў нявызначанасці і нестабільнасці ў свеце ў першым паўгоддзі ВУП Кітая вырас на 5 працэнтаў у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам, а агульны аб'ём імпарту і экспарту тавараў павялічыўся на 6,1 працэнта. Кітай стаў важным рухавіком і стабілізацыйнай сілай глабальнага эканамічнага росту.

Як адзначыў Чжан Вэньчуань, у ліпені паспяхова праведзены трэці пленум ЦК КПК 20-га склікання, на якім прыняты грандыёзны план па ўсебаковым паглыбленні рэформ, пашырэнні адкрытасці знешняму свету і ўсебаковаму садзейнічанню вялікай справе пабудовы магутнай дзяржавы



і нацыянальнага адраджэння праз кітайскую мадэрнізацыю.

Кітай выступае за раўнапраўную і спарадкаваную шматпалярнасць свету, а таксама агульнадаступную і інклюзіўную эканамічную глабалізацыю. Чжан Вэньчуань адзначыў імклівыя, нябачаныя за стагоддзе перамены свету: «Паглыблена разгортваецца чарговая навукова-тэхнічная і прамысловая рэвалюцыя, пераразмяркоўваецца глабальны баланс сіл, назіраецца прыкметны рост уплыву «Глабальнага Поўдня». У гэтых умовах мір, развіццё, супрацоўніцтва і ўзаемны выйгрыш сталі спадзяваннямі народаў і агульнай тэндэнцыяй. У мэтах пабудовы Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва Кітай паслядоўна вылучыў ініцыятыву сумеснага будаўніцтва «Адзін пояс, адзін шлях», Ініцыятыву па глабальным развіцці, Ініцыятыву па глабальнай бяспецы і Ініцыятыву глабальнай цывілізацыі».

Як падкрэсліў пасол, Кітай паслядоўна садзейнічае палітычнаму ўрэгуляванню рэгіянальных гарачых кропак і ўносіць актыўны ўклад у падтрыманне міру і бяспекі ва ўсім свеце. КНР адданая стварэнню платформы супрацоўніцтва адкрытага тыпу. Кітай разам з дзяржавамі, якія развіваюцца, паскараюць тэмпы мадэрнізацыі, надаючы большы імпульс і пашыраючы прастору для мадэрнізацыі краін па ўсім свеце. «Зазіраючы ў будучыню, Кітай, як і раней, працягне выконваць свае абавязкі буйной краіны і будзе працаваць поплеч з міжнароднай супольнасцю, каб бесперапынна прыўносіць сваю мудрасць і сілу ва ўдасканаленне глабальнага кіравання, рэагаванне на перамены свету і вырашэнне цяжкіх праблем чалавецтва», — адзначыў Чжан Вэньчуань.

Як заўважыў пасол, «на працягу 32 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін кітайска-беларускія адносіны заўсёды захоўваюць добрую дынаміку развіцця, а супрацоўніцтва дасягае важкіх вынікаў. У гэтым годзе ўсепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства паміж Кітаем і Беларуссю працягвае прыносіць свой плён».

Чжан Вэньчуань звярнуў увагу на тое, што «ў ліпені Старшыня КНР Сі Цзіньпін і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зноў сустрэліся на пляцоўцы саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў Астане і дасягнулі шэрагу важных дамоўленасцяў. У трэцяй дэкадзе жніўня прэм'ер Дзяржаўнага савета Кітая Лі Цян паспяхова здзейсніў афіцыйны візіт у Беларусь, што надало новы імпульс развіццю прагматычнага супрацоўніцтва».

«У апошнія гады двухбаковы тавараабарот захоўвае тэндэнцыю імклівага росту, супрацоўніцтва ў сумесным будаўніцтве «Адзін пояс, адзін шлях» грунтоўна рухаецца наперад, паспяхова праведзены форум рэктараў вядучых універсітэтаў Кітая і Беларусі, афіцыйна заснаваны Кітайскі цэнтр кнігі ў Беларусі, паспяхова пачаўся Год супрацоўніцтва Кітая і Беларусі ў галіне навукі, тэхналогій і інавацый,



а сяброўства і ўзаемаразуменне паміж двума народамі працягваюць паглыбляцца, — падкрэсліў дыпламат. — Справа кітайска-беларускага дружалюбнага супрацоўніцтва дэманструе пазітыўную тэндэнцыю гарманічнага развіцця і мае шырокія перспектывы».

Кітай — ядро сусветнай эканомікі, падкрэсліў **першы намеснік прэм'ер-міністр Беларусі Мікалай СНАПКОЎ.** «1 кастрычніка 1949 года для Кітая — стартавы пункт імклівага росту і каласальных пераўтварэнняў, якія мы ўсе цяпер назіраем, — перакананы першы віцэ-прэм'ер. — За гэты непрацяглы перыяд Кітайская Народная Рэспубліка дабілася насамрэч выдатных вынікаў, прадэманстраваўшы ўсяму свету яркі прыклад самаадданасці, упартасці і працавітасці на шляху да дасягнення поспехаў у намечаных напрамках. З моманту абвяшчэння палітыкі рэформ і адкрытасці КНР забяспечыла амаль чвэрць глабальнага эканамічнага росту. На сёння гэта найвышэйшы паказчык у свеце. Валавы ўнутраны прадукт за гады існавання краіны вырас у 1850 разоў — з 68 мільярдаў да 126 трыльёнаў юаняў — у сярэднім у 25 разоў штогод».



Сучасны Кітай забяспечвае амаль траціну ад сусветных аб'ёмаў прамысловай вытворчасці. Магчымым гэта стала ў тым ліку дзякуючы пастаяннаму павышэнню якасці і ўзроўню адукацыі. Краіна ўжо выйшла ў сусветныя лідары па колькасці навукова-тэхнічных спецыялістаў. Сёлета мацерыковы Кітай аказаўся першым у свеце па колькасці ВНУ, якія трапілі ў першыя 50 і 100 універсітэтаў па ўплыве даследаванняў. Кітай можа пахваліцца выключнымі дасягненнямі ў галіне тэхналогій і інавацый. Краіне належыць самы вялікі ў свеце радыётэлескоп. Першы спадарожнік квантавай сувязі сканструяваны кітайцамі. Новыя дасягненні адбыліся ў галіне квантавых і гравітацыйных датчыкаў, высокапрадукцыйных вылічэнняў, касмічных запускаў. Менавіта кітайскі апарат упершыню ў гісторыі даставіў на Зямлю ўзоры грунту з адваротнага боку Месяца.

Як адзначыў Мікалай Снапкоў, па даследаванні штучнага інтэлекту Кітай апярэдзіў ЗША, Паўднёвую Карэю, Японію і Індыю. З 2014 да 2023 года арганізацыі з Кітая падалі 38 210 патэнтаў, звязаных са штучным інтэлектам, у той час як ЗША — 6276 патэнтаў, з кратным адставаннем знаходзяцца на другім месцы. «Казаць аб дасягненнях Кітая можна бясконца: ад маштабнай лічбавізацыі ў галіне сельскай гаспадаркі да стварэння шматразовага касмічнага карабля», — заўважыў першы намеснік прэм'ер-міністра.

Як лічыць Мікалай Снапкоў, нягледзячы на складаную геапалітычную абстаноўку, Беларусь і Кітай не паслабілі тэмпы двухбаковага супрацоўніцтва, якое дастойна праходзіць праверку на трываласць. «Для Беларусі Кітай — не проста краіна-партнёр, з якой нас звязваюць дыпламатычныя і гандлёвыя адносіны, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — Мы «жалезныя браты» і неаднойчы на справе, а не на словах пацвярджалі непадробнае і шчырае сяброўства, заснаванае на даверы, узаемнай дапамозе і непахіснай падтрымцы ўзаемных інтарэсаў. Нашы краіны ўстанавілі найвышэйшы ў гісторыі ўзровень адносін — усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. Кіраўнікоў Беларусі і Кітая звязвае моцнае і шчырае сяброўства».

Мінск і Пекін беражліва захоўваюць гістарычную памяць аб гадах барацьбы з фашызмам і мілітарызмам. «Мы адзіныя ў поглядах на сучасную палітычную сітуацыю, будучае светаўладкаванне, — перакананы першы намеснік прэм'ер-міністра. — Беларусь і Кітай аказваюць адзін аднаму безумоўную падтрымку ў пытаннях, якія прадстаўляюць карэнныя інтарэсы. Мы актыўна прасоўваем глабальны парадак дня на міжнародных і рэгіянальных пляцоўках. Разам рэалізоўваем глабальныя ініцыятывы на карысць народаў усіх краін. Мы рухаемся толькі па ўзыходзячай траекторыі».

Як заявіў Мікалай Снапкоў, паміж нашымі краінамі дасягнуты беспрэцэдэнтна высокі ўзровень палітычнага даверу. «Гэта той узровень, да якога мы павінны імкнуцца і па іншых напрамках супрацоўніцтва. Менавіта такая задача перад намі пастаўлена лідарамі Беларусі і Кітая — узняць эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва да ўзроўню палітычнага. Для дасягнення гэтай мэты ўрады вызначылі стрыжневую задачу на сярэднетэрміновую перспектыву — вялікі прыход кітайскіх тэхналогій у Беларусь. Развіццё нашай краіны мы бачым у спалучэнні з канцэпцыяй новых прадукцыйных сіл Кітая на аснове тэхналогій, інавацый і чалавечага патэнцыялу», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер, працытаваўшы словы Прэзідэнта Беларусі, якія ніколі не страцяць сваёй актуальнасці: «з моцным Кітаем будзе моцнай і Беларусь».

Мікалай Снапкоў выказаў упэўненасць, што з новымі сіламі, новымі ідэямі аб далейшым паглыбленні беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння мы зможам рэалізаваць бягучыя дамоўленасці і, як сказаў прэм'ер Дзяржсавета Лі Цян, узгоднім новы пакет супрацоўніцтва.

«Кітайскі бок гатовы ісці разам з беларускім бокам, працаваць над рэалізацыяй усіх важных дамоўленасцяў, дасягнутых кіраўнікамі дзвюх краін, прадаўжаць прасоўваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю ў розных галінах на карысць народаў дзвюх краін», — падкрэсліў Чжан Вэньчуань. — У Беларусі кажуць: «Моцнае сяброўства сякерай не рассячэш». У кітайцаў таксама ёсць добрая прыказка: «Агульнасць шляху захоўваецца на любой адлегласці, яна мацнейшая за клей, больш трывалая, чым алмаз». Я перакананы, што, прытрымліваючыся развіцця са стратэгічнай вышыні і ў доўгатэрміновай перспектыве, кітайска-беларускія адносіны ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства абавязкова дасягнуць яшчэ больш бліскучых поспехаў і адкрыюць яшчэ больш цудоўную будучыню».

«Няхай Беларусь і Кітай і далей ідуць поплеч, дэманструючы ўсяму свету прыклад сапраўднага брацкага сяброўства і ўзорнага супрацоўніцтва, непадуладнага часу, геаграфічнай адлегласці і знешняму ўплыву», — пажадаў Мікалай Снапкоў.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Радиоволна» в г. Гродно 22 октября 2024 года

| | | |
|---|---|---|
| **Вид аукциона** | | Открытый |
| **Продавец** | | Открытое акционерное общество «Радиоволна», г. Гродно, ул. Максима Горького, 89, тел. 8 (152) 62-66-48 |
| **Лот № 1** | Имущество, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000002011232, по ул. Максима Горького, 89Б площадью 0,6697 га (имущественное право земельного участка – право аренды):<br>**Капитальное строение с инвентарным номером 400/U-162753** (незавершенное законсервированное капитальное строение) площадью 6520,40 кв. м; **капитальное строение с инвентарным номером 400/С-163014** (благоустройство), площадью 474 кв. м, составные части и принадлежности: проезд (а1), тротуар (а2), ограждение (наружное) (а3), ограждение (из колючей проволоки) (а4), ограждение (из металлической сетки) (а5), подпорная стена (а6).<br>При переходе права собственности на незавершенное законсервированное капитальное строение и права аренды на земельный участок возможно использование их новым собственником для размещения промышленных предприятий, транспортной и инженерной инфраструктуры, коммунальных, коммунально-складских и складских объектов, обеспечивающих функционирование этих предприятий.<br>Начальная цена продажи: **326 708,59** рублей (с учетом НДС 20 %).<br>Сумма задатка: 16 335,00 рублей | |
| Организатор аукциона: **Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 62-60-55, 62-60-56** | | |
| Дата проведения аукциона: **22 октября 2024 года.** Время проведения аукциона: 12.00 | | |
| Место проведения аукциона: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал** | | |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 117** | | |
| Дата и время начала приема документов: **30 сентября 2024 года в 8.00** | | |
| Дата и время окончания приема документов: **16 октября 2024 года в 17.00** | | |

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона 5 %.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений об оплате задатка на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа – 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»;
- юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Торги в отношении предмета аукциона проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Срок заключения договора купли-продажи – в течение 15 рабочих дней с момента проведения торгов.

Оплата производится в течение 30 календарных дней с момента заключения договора.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Извещение опубликовано на сайтах: Государственного комитета по имуществу (au.nca.by), Гродненского городского исполнительного комитета (grodno.gov.by), коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» (gcn.by).

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 50 %

**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1.**

**Продавец: ОАО «Калинковичский завод бытовой химии», г. Калинковичи, ул. Чехова, 17, УНП 400023080.**

**Торги состоятся 11 октября 2024 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, каб. 28.**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условия продажи: 1.** Инженерные сети (электрические, водопроводные, канализационные), проходящие внутри границ приобретенного участка, являются собственностью ОАО «Калинковичский завод бытовой химии». Их дальнейшее совместное использование, ремонт (включая капитальный) модернизацию, замену, демонтаж, реконструкцию, подсоединение вновь разводимых к существующим новый собственник осуществляет за свой счет по согласованию с ОАО «Калинковичский завод бытовой химии» (или его преемником). **2.** Не позднее 2 (двух) месячного срока со дня подписания договора купли-продажи новый собственник обязан установить ограждение по границам приобретенного земельного участка. **3.** Победитель аукционных торгов дополнительно возмещает расходы по предпродажной подготовке по определению рыночной стоимости в сумме: **лот № 1 – 660,00** бел. руб.; **лот № 2 – 120,00** бел. руб. **Обязательные условия:** использование объекта при условии реконструкции для размещения объектов розничной торговли, объектов бытового обслуживания населения, станций технического обслуживания, объектов оптовой и розничной торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции; в случае проведения проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта осуществить работы в срок, не превышающий 1 год; в случае разработки проектно-сметной документации осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; в случае нарушения условий покупатель уплачивает **штраф в размере 10 процентов от цены продажи имущества** | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 333/С-21735**, общей площадью **591,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад сырья**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В. **Капитальное строение с инв. № 333/С-21725**, общей площадью **717,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание склада с навесом для хранения котельного топлива**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В/1. **Капитальное строение с инв. № 333/С-21740**, общей площадью **18,5 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание туалета**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В/2. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **322350100003006201,** общей площадью **0,5760 га (право аренды).** **Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания склада сырья | **119 640,00** | 11 964,00 |
| 2 | **Рубительная машина УВЫИН (EDSBHUGGEN) 250 Н,** инв. № 1001149. **Местонахождение:** г. Калинковичи, ул. Чехова, 17 | **11 880,00** | 1 188,00 |

**Продавец:** ОАО «Калинковичский завод бытовой химии», 247710, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел. **8 (033) 616-72-16, Чернявский Эдуард Петрович;** заключение договора купли-продажи по **тел. 8 (029) 532-70-87, Логвина Аксана Ивановна.**

**Шаг аукционных торгов – 15 % (пятнадцать) от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Калинковичский завод бытовой химии»):** BY70 BLBB 3012 0400 0230 8000 1001, БИК BLBBBY2X, в ЦБУ № 307 ОАО «Белинвестбанк» г. Калинковичи, УНП 400023080, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №… (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 26 сентября 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 9 октября 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

**Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.**

**Предоставляется рассрочка платежа по заявлению (лот № 1), в соответствии с действующим законодательством РБ.**

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 22.08.2024 г. № 163 (30297).

Проводится аукцион в соответствии с Положением закрытого акционерного общества «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – https://ocenkaservis.by (раздел Очные торги»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база»).

**Организатор аукционных торгов:**
**☎ 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru.**

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

### ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. Тел.: +375 17 310-36-37 |
| **Продавец** | Вязынский сельский исполнительный комитет, 222445, Минская обл., Вилейский р-н, аг. Вязынь, ул. Заводская, 17. Тел.: 8 (01771) 66252 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, пом. 5. Тел. +375 17 373-21-33. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |
| **Предмет электронных торгов:** **Легковой универсал VAZ-21713 135-21,** рег/зн. 5НА Т 2013, № кузова ХТА217130С0094458, 2012 г. в., инв. № 01540002, по адресу: Минская обл., аг. Вязынь, ул. Заводская, 17 | |
| **Начальная цена лота (без НДС) – 4 690,00 бел. рублей.** Шаг торгов – 234,50 бел. рублей | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 14.10.2024.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **11.10.2024** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by** | |
| Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (http://gki.gov.by) от 26.09.2024 г. | |
| **Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37, +375 (29) 154-34-35. **E-mail:** auction@cpo.by | |

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321) по поручению **открытого акционерного общества «Смолевичи-Сузон»** (продавец, местонахождение: 222201, Минская область, г. Смолевичи, ул. Вокзальная, 9а) проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот 1: трактор FENDT 936 Vario TMS,**
**2008 г. в., зав. номер (VIN) 934232435, рег. знак ОВ-5 2412, находящийся по адресу: Минская обл., Червенский р-н, Руднянский с/с, аг. Рудня.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **179 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **17 900,00** бел. руб.

**Лот 2: обмотчик PAK 1010,**
**2006 г. в., сер. номер 34002050119, находящийся по адресу: Минская обл., Червенский р-н, Руднянский с/с, аг. Рудня.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **12 200,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1220,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в следующем размере: по лоту № 1 – **3 (трех)** процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – **10 (десяти)** процентов.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **28.10.2024** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.10.2024** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра (8029) 102 91 76.**

УНП 691747895

### ИНФОРМАЦИЯ о проведении открытого повторного аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Кричеврайагропромтехснаб»

**Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации»,** 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, тел.: 8-0222-42-25-64, 8-029-15-15-444.

**Повторный аукцион состоится 16 октября 2024 года в 15.00 по адресу: г. Могилев, пер. Комиссариатский, 5.**

**Предмет аукциона**
(наименование объекта, его местонахождение, площадь, кв. м):

**ЛОТ № 1 – капитальное строение общей площадью 360,2 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, Костюшковичский с/с, 1/9, 0,1 км восточнее д. Залесовичи.**

Начальная цена продажи – 16 020 р. 00 к. (с учетом НДС).

**Начальная цена понижена на 50 %.**
Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206.

**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 11 октября 2024 года до 13.00.**

Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
**Информация об опубликовании извещения размещена на официальных сайтах:**
Могилевского областного исполнительного комитета (**www.mogilev-region.gov.by**),
Могилевского городского исполнительного комитета (**www.mogilev.gov.by**).

УНП 700008710

# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

26 ВЕРАСНЯ 2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 17 (15985)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*



## Кірыл НІКІЦІН: «НАТХНЯЮЦЬ ЗВЫЧАЙНА ДРОБЯЗІ»

У НАДТ імя Максіма Горкага, які цяпер часова паказвае свае пастаноўкі на сцэне Палаца культуры прафсаюзаў, заўсёды адчуваеш чароўную атмасферу. Туды хочацца вяртацца. І адна з галоўных прычын — людзі, якія там працуюць. Сярод іх, вядома, ёсць шмат маладых і таленавітых маладых творчых асоб. Карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены» распытала ў аднаго з іх, акцёра Кірыла Нікіціна, пра цікавасць да выбранай прафесіі, тэатральнае жыццё, калектыў, натхненне і ўласныя амбіцыі.

— У маім жыцці выбар прафесіі не быў запланаваны, неяк нечакана ўспыхнула: хачу быць акцёрам. На гэта паўплывала тое, што я доўгі час не мог вызначыцца, кім стаць: ці ўрачом, ці айцішнікам. А выбраў акцёрам. З першага разу ў Акадэмію мастацтваў не паступіў, таму спачатку адвучыўся ў Віцебскім дзяржаўным каледжы культуры і мастацтваў, а пасля вырашыў, што я не надта гатовы для прафесіі, таму паспрабаваў паступіць у ВНУ яшчэ раз — атрымалася. Бацькі да выбару ставіліся насцярожана, з недаверам, але не былі супраць. І лічу, што гэта нармальна, прафесія спачатку здаецца незразумелай. Бацька казаў: «Калі хочаш нечага дабіцца, рабі гэта самастойна». Дарэчы, мінулым летам яны былі на прэм'еры спектакля «Фаўст. Здзелка з д'яблам», дзе я задзейнічаны ў галоўнай ролі, і ўбачылі, што ўсё не дарма.

***— А вы ніколі не шкадавалі аб сваім выбары?***

— Не. Бывала, напрыклад, нешта не атрымлівалася, сумняваўся менавіта ў рабочых момантах. Але ж цалкам разумею, што гэта тое, чым хачу займацца па жыцці, ад чаго атрымліваю ўвесь час задавальненне, нягледзячы на неверагодныя цяжкасці, якія ўзнікаюць амаль кожны дзень: падчас рэпетыцый, спектакляў. Не ведаю, наколькі добра ў мяне атрымліваецца, але я сябе ў прафесіі адчуваю як рыба ў вадзе.

***— Як прыйшлі працаваць у тэатр?***

— Першая сустрэча з тэатрам адбылася на першым курсе. Я трапіў на паказ пастаноўкі «Пясняр» па матывах п'есы Васіля Дранько-Майсюка, дзе ўбачыў трупу, з якой хацелася працаваць. І спектакль мяне неверагодна ўразіў. Таму ідэя працаваць тут не пакідала на працягу чатырох гадоў вучобы. А пасля мяне паклікалі на праслухоўванне. Не памятаю, ці добра я там сябе паказаў, але атрымаў работу. Для мяне наш тэатр найлепшы. З калег па тэатры я ўвесь час бяру прыклад. Напрыклад, калі вучыўся яшчэ ў каледжы ў Віцебску, часта чуў пра Сяргея Жбанкова, які працуе ў нашым тэатры. І, як толькі трапіў у тэатр, мая першая роля была ў партнёрстве з ім. Увогуле, магу вам усіх пералічыць. Нават сваю сістэму нейкую выбудоўваю праз назіранне за імі: як трэба рабіць ці наадварот. Тэатр у першую чаргу — гэта калектыў. Мы разам абмяркоўваем тое, што нас хвалюе, радуемся, сумуем. Мы сталі сябрамі, праводзім вельмі шмат часу ў тэатры не толькі ў рабочым працэсе, але і па-за ім. Увогуле, лічу, у нас сфарміравалася крутая каманда, спадзяюся, будзем разам працаваць і далей.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

*Час маладых*

## Адкрыць Беларусь па-новаму

На гэтым тыдні завяршыўся міжнародны праект «Аўтацягнік#Беларусь.Моладзь.Профі». Ён доўжыўся з 17 да 24 верасня і аб'яднаў 120 юнакоў і дзяўчат — прадстаўнікоў студэнцкай, навуковай, творчай і працоўнай моладзі з Беларусі і Расіі. Падчас праекта ўдзельнікі на брэндаваных аўтобусах аб'ехалі шэраг населеных пунктаў Беларусі ў розных абласцях краіны, дзе наведалі буйныя і горадаўтваральныя прадпрыемствы для абмену вопытам і дэманстрацыі інавацый у розных сферах прамысловасці. Для юных удзельнікаў таксама праводзіліся дабрачынныя, экскурсійныя, адукацыйныя, спартыўныя, культурныя і грамадска карысныя мерапрыемствы.

Арганізатарам праекта выступілі Міністэрства адукацыі Беларусі, Рэспубліканскі маладзёжны цэнтр і БРСМ. Яго асноўная задача — узмацніць ролю моладзі ў развіцці дабрачыннай дзейнасці і сфарміраваць талерантнае стаўленне да людзей, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, а таксама ў захаванні гістарычнай памяці, гісторыка-культурнай спадчыны і нацыянальных традыцый Беларусі. Упершыню ў аўтацягніка з'явіўся свой слоган «Час першых!», прымеркаваны да 30-годдзя інстытута прэзідэнцтва.



Фота БелТА.

Вітаючы ўдзельнікаў праекта, начальнік упраўлення грамадскіх камунікацый Галоўнага ўпраўлення інфармацыйнай палітыкі і грамадскага развіцця Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Арцём Свірыдаў заклікаў моладзь убачыць у падарожжы тую Беларусь, якую не заўсёды пакажуць у тэлевізары і ў сацыяльных сетках. Па словах намесніка міністра адукацыі Кацярыны Пятруцкай, праект дазволіць маладым людзям паглядзець на прамысловасць, сельскую гаспадарку, рэальны сектар эканомікі Беларусі з іншага боку. Прыехаўшы дадому, размаўляючы са сваімі аднагодкамі, яны змогуць расказаць аб тых прафесіях, тых рэальных людзях працы, з якімі пазнаёміліся. Таму праект носіць яшчэ і адукацыйную, і прафарыентацыйную накіраванасці.

Пасля ўрачыстага адкрыцця адна з груп наведала ААТ «ККХ «Белкамунмаш», дзе адбылася дыялогавая пляцоўка з працоўнай моладдзю. Паралельна другая група трапіла на ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў» (VOLAT), затым для ўдзельнікаў аўтацягніка правялі экскурсію па Мінску. Завяршыўся першы дзень праекта культурна-патрыятычным форумам «Калі адзіныя — мы непераможныя».

Усяго за час праекта маладыя людзі наведалі амаль два дзясяткі населеных пунктаў Беларусі. І ў кожным сталі ўдзельнікамі важных мерапрыемстваў, акцый. Так, студэнткі Ліпецкага педагагічнага ўніверсітэта расказалі, што прыехалі ў Беларусь упершыню з жаданнем не толькі адкрыць новыя гарады, але і культуру краіны. Па словах Паўла Максімовіча з Мазыра, такія акцыі спрыяюць культурнай дасведчанасці моладзі, паколькі не ва ўсіх ёсць магчымасць наведаць прадпрыемствы краіны, убачыць, як жывуць іншыя гарады: «Пасля вяртання дадому можна падзяліцца ўбачаным з калегамі. Гэта вельмі каштоўны вопыт, які дапаможа ў прафесіі».

## Супрацоўніцтва з акцэнтам на будучыню

XII Беларуска-расійскі маладзёжны форум праходзіць у Мінску 25 і 26 верасня. Удзельнікамі мерапрыемства сталі каля 70 чалавек — прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь і шасці рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі.


Фота Лізаветы ГОЛАД.

Па словах **сакратара ЦК БРСМ Крысціны САРОКІ,** удзельнікаў форуму чакае вельмі насычаная двухдзённая праграма.

– У першы дзень прайшло пленарнае пасяджэнне, на якім абмяркоўваліся пытанні маладзёжнай палітыкі, дарожныя карты сумеснай дзейнасці з Расійскай Федэрацыяй, а ўжо ў другі дзень удзельнікі форуму будуць працаваць на трох розных секцыях. Гэта «Развіццё медыйна-інфармацыйнай пісьменнасці: новыя тэхналогіі і выклікі», «Валанцёрскі рух Расіі і Беларусі: мэты і асноўныя напрамкі дзейнасці», «Роля маладзёжных грамадскіх арганізацый ва ўмацаванні маладзёжнага супрацоўніцтва і вырашэнні агульных праблем і выклікаў», — адзначыла яна.

Дзелавую праграму мерапрыемства разнастаіла ўскладанне кветак каля стэлы «Мінск — горад-герой» і інтэлектуальна-забаўляльная віктарына.

У сваю чаргу **старшыня камісіі парламенцкага сходу саюза Беларусі і Расіі па маладзёжнай палітыцы, спорце і турызме Арцём ТУРАЎ** заявіў, што галоўнае для моладзі нашых краін — гэта супрацоўніцтва.

— Сёлета мы рэалізуем гэты форум ужо дванаццаты раз. Гэта гаворыць аб яго запатрабаванасці і яго важнейшай ролі ў фарміраванні маладзёжнай палітыкі Саюзнай дзяржавы, — дадаў ён.

Па словах Арцёма Турава, менавіта тут ёсць канкрэтныя мерапрыемствы, на якіх маладыя людзі выступаюць з тымі прапановамі, якія далей трапляюць у план узаемадзеяння паміж нашымі краінамі.

— Цудоўна, калі маладыя людзі нашых краін самі выходзяць з ініцыятывамі па тых ці іншых пытаннях. У першую чаргу трэба клапаціцца пра захаванне гістарычнай памяці, таму што ад гэтага залежыць наша будучыня. Тут вельмі важна, каб моладзь разам фарміравала планы, адказвала на тыя выклікі і пагрозы, якія сёння існуюць, — падзяліўся ён.

Завершыцца форум падвядзеннем вынікаў, а таксама ўручэннем сертыфікатаў удзельнікам.

# «НАТХНЯЮЦЬ ЗВЫЧАЙНА ДРОБЯЗІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Скажыце, ці не стала за гады работы для вас акцёрская прафесія руцінай?***

— Я гэту прафесію выбраў у тым ліку для таго, каб пазбегнуць руціны. Штодня сядзець і выконваць адну і тую ж задачу не па мне. Люблю адкрываць новае. У нашым тэатры за апошнія два гады паставілі дванаццаць спектакляў. Гэта быў насычаны працоўны перыяд. З-за чаго рэдка здараліся выхадныя, і я быў вельмі шчаслівы. Расклад такі: з раніцы рэпетыцыя, вечарам спектакль. Так атрымліваецца, што нават у старых спектаклях імкнешся кожны раз раскрыць свайго героя пановаму, рэалізоўваеш новыя ідэі. Мая прафесія тым і каштоўная, што не аднастайная.

***— Здаецца, вы ўсё жыццё прысвячаеце творчаму працэсу. Ці застаецца час на нешта яшчэ акрамя працы?***

— Недахоп часу — гэта перашкода, якую мы пераадольваем, каб дасягнуць чагосьці. Нейкія жыццёвыя моманты з часам насамрэч адсейваюцца, і ты разумееш, што, значыць, гэта было непатрэбна. Мне цудоўна жывецца. Я яшчэ ў гэтым годзе пачаў у акадэміі выкладаць сцэнічны рух. І на ўсё хапае часу.



***— Якая з сыграных роляў была для вас самай нечаканай і ці ёсць у вас роля мары?***

— Роля маладога Фаўста ў пастаноўцы Іагана Вольфганга фон Гётэ «Фаўст. Здзелка з д'ябалам». Для мяне было нечакана атрымаць такую значную ролю, асабліва ў параўнанні з ролямі другога плана, якія я выконваў да гэтага. Калі прапанавалі, у мяне з'явілася адчуванне, што я як быццам не ўмею радавацца такім рэчам. Мне рэжысёр сказаў, што гэтая роля будзе маёй, а я толькі праз дзень падумаў: «Як цудоўна!»

Што датычыцца ролі мары, магу назваць пастаноўку «Пікавая дама» па матывах аповесці Аляксандра Пушкіна, дзе мне выпала іграць ролю Германа. Яшчэ ў акадэміі мы спрабавалі ставіць урывак з твора, але не атрымалася. І тут да юбілею актрысы Наталлі Чамадуравай быў прадстаўлены гэты спектакль. Таксама мне падабаецца мая роля ў спектаклі «Маскарад» Міхаіла Лермантава, дзе іграю князя Звездзіча. У ім удалося многае ўвасобіць з таго, што я бачыў у іншых тэатрах, у Маскве і Санкт-Пецярбургу... У акадэміі мы некалі ставілі ўрывак з рамана «Злачынства і пакаранне» Фёдара Дастаеўскага, вось такое хацелася б таксама паспрабаваць сыграць...

***— Я так разумею, вы сочыце за тым, што паказваюць калегі з іншых тэатраў...***

— Цяпер рэдка атрымліваецца адсочваць з-за шчыльнага графіка, але стараюся. У РТБД хадзіў, у ТЮГ таксама хочацца, дзе шмат прэм'ер. Нядаўна былі на фестывалі «Белая вежа» ў Брэсце. Там мой сябра Аляксандр Ніканенка, акцёр РТБД, іграе ў пастаноўцы «Карней». Наведваў спектакль,назіраў за калегам і неверагодна радаваўся яго поспеху.

***— Як уплывае звычайнае жыццё на тэатральную работу?***

— Нядаўна сваім студэнтам расказваў, што ўсе акцёры вельмі тонка ўспрымаюць жыццё. Скажыце, што мы цудоўна выканалі ролю — адразу ўбачыце ўсмешку на твары. І наадварот. Сумна бывае не апраўдаць давер гледача, але гэта вяртае да таго, што мы таксама жывыя людзі, са сваімі перажываннямі і эмоцыямі.

***— Чым цікавіцеся акрамя тэатра?***

— Кіно гляджу. У расійскім кінематографе ўсё крута развіваецца, шмат прэм'ер. Гляджу розныя фільмы ў залежнасці ад абставін. Калі ставілі ў тэатры «Ідыёта» Фёдара Дастаеўскага, я прыходзіў дадому і ўключаў максімальна лёгкія для ўспрымання серыялы накшталт «Кухні», каб адпачыць. А бывае, хочацца паглядзець нешта сур'ёзнае, над чым трэба падумаць. Яшчэ вельмі люблю фатаграфаваць. Таксама спортам стаў нядаўна займацца. Што б яшчэ хацелася, дык гэта мець сталярную майстэрню ва ўласным доме і выразаць фігуркі з дрэва, каб галава адпачывала.

***— Ёсць амбіцыі паспрабаваць сябе ў кіно?***

— Так, гэта ж зусім іншы свет. Мне хацелася б паспрабаваць сябе ў кіно не дзеля грошай або галоўных роляў, а проста паглядзець спачатку, як я наогул у кадры выглядаю. Мне здаецца, я змагу і ў тэатры, і ў кіно сябе добра праявіць. Хацелася б у гэта верыць.

***— А што вас натхняе?***

— Не так даўно з калегам абмяркоўвалі гэтае пытанне і прыйшлі да высновы, што натхняюць звычайна дробязі. Едзеш у метро — і назіраеш за людзьмі, іх паводзінамі, рухамі. Яшчэ музыка натхняе. Я нядаўна набыў сабе прайгравальнік і стаў самым шчаслівым чалавекам на Зямлі.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота з асабістага архіва героя.**

*Узаемадзеянне*

# Камандная работа, баявы настрой і падтрымка

Днямі ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» адбылося ўрачыстае закрыццё і ўзнагароджанне пераможцаў XXVII Рэспубліканскага злёту юных ратавальнікаў-пажарных. Унікальная штогадовая сустрэча хлопцаў і дзяўчат узростам да 16 гадоў праводзіцца пад эгідай Міністэрства па надзвычайных сітуацыях з мэтай фарміравання ў дзяцей і падлеткаў навыкаў бяспечных паводзін. Злёт аб'яднаў восем каманд з усіх рэгіёнаў краіны. За званне найлепшых у ратавальнай справе пазмагаліся каля 200 чалавек. Карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведаў мерапрыемства і высветліў, ці проста даецца перамога і чаму навучыліся ўдзельнікі.




## НЕ ТОЛЬКІ ТРАДЫЦЫЯ

Сёлета па выніках спаборніцтваў перамога дасталася юным ратавальнікам Ліцэя МНС, другое месца заняла каманда з Віцебскай вобласці, а трэцяе — брастаўчане. На працягу 10 дзён удзельнікам злёту трэба было прайсці розныя конкурсныя выпрабаванні. Сярод іх — «Агляд строя», «КВЗ», «Інтэрнэт-пошук», «Знаўцы АБЖ», «Хіт бяспекі», «Ратаванне на вадзе», «Аказанне першай дапамогі», «Зводныя палявыя вучэнні», «Пажарны кросфіт».




«Я хачу чарговы раз падзякаваць вам, за вашу непадробную энергію, якую вы ўсялілі ў нас, дарослых, — звярнуўся да прысутных **міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ.** — Дадзены злёт заканчваецца, пачынаецца падрыхтоўка да новага. Пройдзе час, хтосьці прыедзе сюды паўторна, як найлепшы прадстаўнік свайго рэгіёна, хтосьці ўжо паступіць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Я спадзяюся, што частка з вас абярэ Універсітэт грамадзянскай абароны і стане беларускімі ратавальнікамі, як гэта зрабіла капітан каманды Мінскай вобласці, якая сёння прынесла прысягу і стала курсантам дадзенага ўніверсітэта».

Вадзім Сіняўскі дадаў, што правядзенне такіх злётаў — не толькі традыцыя, але і неад'емная частка дзейнасці міністэрства: «У гэтую дзейнасць уцягнуты дзеці з усіх рэгіёнаў Беларусі. Вельмі важна, каб гэты рух працягваўся, развіваўся і мацнеў. Трэба, каб дзеці любілі сваю краіну, былі сапраўднымі беларусамі і па душы, і па сумленні, і па свядомасці».

## «ГАРАЦЬ, АЛЕ НЕ ЗГАРАЮЦЬ»

Яркай фінальнай кропкай XXVII Рэспубліканскага злёту юных ратавальнікаў-пажарных стаў канцэрт, падрыхтаваны сіламі каманд-удзельніц і выпускнікоў злёту мінулых гадоў, якія з любоўю ўспаміналі час, праведзены ў «Зубраняці».

Па словах **першага сакратара ЦК БРСМ Аляксандра ЛУК'ЯНАВА,** якасць каманд, прапрацоўка, пачуццё патрыятызму з кожным годам растуць: «У свой час я таксама быў удзельнікам злёту. Сёння адчуваеш гонар, калі бачыш, што наша моладзь становіцца лепшай, цікавейшай. Але самае галоўнае — яны адна вялікая каманда. І вучацца галоўнаму — быць адказнымі за будучыню краіны, за тых людзей, якія з імі побач».

За час злёту ўдзельнікі прайшлі праз 12 пляцовак, падрыхтавалі творчыя нумары, навучыліся аказваць медыцынскую дапамогу, пераадолелі паласу перашкод. Асобную ўдзячнасць першы сакратар ЦК БРСМ выказаў ратавальнаму ведамству за клопат, асабісты ўдзел міністра, дзякуючы якому моладзь адчувае ўвагу да сябе і дасягае максімальна эфектыўных вынікаў. «Паглядзіце на дзяцей, яны заражаныя, гараць, але не згараюць, гараць жаданнем дапамагчы іншым», — парадаваўся ён.

## «АДЗІН ЗА ЎСІХ І ЎСЕ ЗА АДНАГО»

Пасля канцэртнай праграмы і цырымоніі закрыцця злёту пазнаёміліся з юнымі пераможцамі. Капітану каманды «Факел» Ліцэя МНС Арсенію ФЕДЗЮКОВУ 15 гадоў. Малады чалавек прыехаў з Баранавіч Брэсцкай вобласці, паступіў у ліцэй па сваім жаданні. «На злёце мы актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх конкурсах, атрымалі яркія эмоцыі. У нас была згуртаваная каманда. Спачатку, вядома, перажывалі, але потым аб'ядналіся, пазнаёміліся і, як вынік, добра сябе паказалі. Паспелі пасябраваць і з іншымі камандамі».

Ганне РАГАЖЫНСКАЙ з каманды «Паўночнікі» Віцебскай вобласці 14 гадоў. На злёце ратавальнікаў-пажарных яна другі год запар. Дзяўчынка таксама плануе звязаць сваё жыццё з ратавальным ведамствам. «Перамога далася нам няпроста. Летась мы былі пятымі, а сёння занялі ганаровае другое месца. У параўнанні з мінулым злётам шмат чаго змянілася: самі каманды, нашы ўзаемаадносіны. Камандная работа, баявы настрой, адказны падыход да заняткаў, наша старанаснасць і падтрымка ад кіраўніцтва дазволілі трапіць у тройку лідараў. У будучыні я планую звязаць сваё жыццё з МНС. Прафесія ратавальніка вельмі важная і адказная. Любоў да яе мне прывіла мая мама. Яна кіраўнік ваенна-патрыятычнага класа ў школе. У дзяцінстве часта глядзела на яе і яе выхаванцаў і была настолькі ўражаная, што дала слова звязаць сваё жыццё менавіта з ратавальным ведамствам. І сёння я стаю тут з медалём пераможцы»!

Марыі АСТАПЧУК з каманды «Гефест» Брэсцкай вобласці 16 гадоў. Чацвёрты раз яна становіцца ўдзельніцай злёту юных ратавальнікаў-пажарных. «На жаль, для мяне гэта апошні злёт. Але радуе, што каманда Брэсцкай вобласці праз 25 гадоў зноў вярнулася на п'едэстал, мы занялі ганаровае трэцяе месца! Эмоцыі перапаўняюць. З году ў год прыязджаеш сюды і нешта новае для сябе адкрываеш, па-іншаму глядзіш на рэчы, на тыя ж няўдачы, спакайней да іх ставішся. Лічу, такой згуртаванасці, як у нашай камандзе, больш нідзе няма. Тут мы сталі сапраўднай сям'ёй. Вядома, без каманды, без такога настрою, дзе адзін за ўсіх і ўсе за аднаго, і не атрымалася б нічога».

**Даніил ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота прэс-службы МНС.**
*Мядзельскі раён.*

*Трэці семестр*

# ДОБРЫ БОНУС У ЖЫЦЦІ




Студатрадаўскаму руху Беларусі ўжо больш за 60 гадоў. Старэйшаму пакаленню байцоў студэнцкія атрады запомніліся непаўторнай рамантыкай, песнямі каля вогнішча, марамі і першым каханнем. Нікуды гэта не падзелася і цяпер. За дзесяцігоддзі не памяняліся і галоўныя мэты руху — выхаванне ў моладзі ініцыятыўнасці, самастойнасці і каманднага духу. На апошнім месцы ніколі не стаяла і магчымасць зарабіць грошы. Хіба што сёння па студэнцкую рамантыку не трэба ехаць за тысячы кіламетраў, а працаваць можна не пару летніх месяцаў, а на працягу года.

## Заробак — круглы год

Паводле слоў **кансультанта ўпраўлення па справах моладзі галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Беларусі Віялеты КРАЎЦОВАЙ,** калі раней працоўная занятасць моладзі прыпадала на летні перыяд, то цяпер трэці семестр фактычна круглагадовы.



— Працаўладкаванне ў вольны ад вучобы час для нас у прыярытэце. Занятасць круглагадовая, але ў летні перыяд моладзі, ахопленай часовай працоўнай занятасцю і працай у студэнцкіх атрадах, відома, больш. З пачатку года часовай працоўнай занятасцю па лініі Міністэрства працы і сацабароны ўжо ахоплена больш за 35 тысяч маладых людзей. Таксама больш за 45 тысяч чалавек працаўладкаваны ў складзе студэнцкіх атрадаў.

Спецыяліст падзялілася, што асабліва шырокі попыт на працоўныя праекты, якія рэалізоўваюцца на беларускіх прадпрыемствах-флагманах — «Атлант», МАЗ, МТЗ. Гэта дае добры вопыт для дзяцей у плане практыкі і ў выбары будучай прафесіі. Дзейнасць па павелічэнні колькасці занятай у вольны ад вучобы час моладзі ў краіне вядзецца пастаянна. Агульным каардынатарам з'яўляецца Міністэрства адукацыі. Для прыцягнення маладых людзей у працоўны працэс выкарыстоўваюцца розныя платформы — СМІ, «Моладзь Беларусі» і інш. У маі 2024-га дзейнічала гарачая лінія Мінадукацыі, куды маглі звяртацца саіскальнікі сезоннай работы, іх бацькі або законныя прадстаўнікі. Толькі за пяць дзён туды дазванілася 190 абанентаў! І ўсе атрымалі адказы на пытанні, якія іх цікавілі і датычыліся як заканадаўства ў гэтай сферы, так і чыста практычных нюансаў часовага працаўладкавання.

## Захавалі і прымножылі

**Камандзір Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ Надзея ШАХОЎСКАЯ** канстатуе, што з 45 тысяч працаўладкаваных на дадзены момант маладых людзей 21,6 тысячы — непаўналетнія. У лідарах па занятасці моладзі — Мінск і больш за 15,7 тысячы чалавек, затым ідзе Гродзенская вобласць і каля 6,7 тысячы студатрадаўцаў, далей — Магілёўшчына, дзе працаўладкавана больш за 5,6 тысячы моладзі. Самы папулярны кірунак — сэрвісныя атрады, прыхільнікамі якіх з'яўляюцца больш за 14 тысяч юнакоў і дзяўчат.

— Месцы працы для падлеткаў абмежаваны заканадаўствам, — кажа камандзір штаба. — Таму большасць з іх задзейнічаны ў экалагічных, сэрвісных і сельскагаспадарчых атрадах, але многія ўдзельнічаюць і ў іншых кірунках.

**Сакратар ЦК ГА «БРСМ» Павел АЛЕКСА** лічыць, што практыка студэнцкіх атрадаў — найлепшае, што было захавана і культывуецца з часоў камсамола.

— Гэта не толькі школа жыцця, але і карысны ўнёсак моладзі ў сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны. Акрамя працоўнага выхавання, там чалавек вучыцца выбудоўваць адносіны ў калектыве. Некаторыя пасля студатрадаў працягваюць сябраваць, ствараюць сем'і.




## Юрый МІХАЛАП і праект «Аўтазаводзец»

У цэхах і на канвееры Мінскага аўтамабільнага завода моладзь удзельнічала ў вытворчасці аўтобусаў, прычэпаў, грузавікоў.

— Нам падабаецца быць часткай гэтага вялізнага прадпрыемства, — дзеліцца камандзір Рэспубліканскага вытворчага працоўнага праекта «Аўтазаводзец» Юрый Міхалап, — падабаецца, як сур'ёзна ставяцца да нас члены калектыву, як падтрымліваюць і дапамагаюць. На прадпрыемстве працавалі каля 200 студатрадаўцаў: на зборачным канвееры, аўтобусным заводзе, у прэсава-кавальскім цэху.

Сёлета да беларусаў далучылася моладзь з Казані. Засталіся задаволеныя ўсім: і працай, і зарплатай. А ў пазапрацоўны час яны разам са сваімі беларускімі «калегамі» з задавальненнем бралі ўдзел у спартыўных і культурна-масавых мерапрыемствах.

## Максім СТАРАВОЙТАЎ і праект «Трактарабудаўнік»

— Трактарны завод нездарма называюць горадам у горадзе, — адзначае майстар Рэспубліканскага міжпрофільнага працоўнага праекта «Трактарабудаўнік-2024» Максім Старавойтаў. — Каб абысці яго, не хопіць і дня. Вялікая колькасць цэхаў, практычна ў кожным з якіх ёсць свая сталовая, вялізная тэрыторыя, на якой у тым ліку вядуцца і нейкія рамонтна-будаўнічыя работы. Таму былі сфарміраваны не толькі вытворчыя, але і сэрвісныя, і будаўнічыя атрады — у залежнасці ад профілю навучання байцы студатрадаў былі накіраваны ў цэхі прадпрыемства, на камбінат грамадскага харчавання і ў жыллёва-камунальны аддзел. Але больш за ўсё нашых байцоў працавала ў корпусе зборкі трактароў і механічным цэху № 2. Думка аб тым, што ты маеш дачыненне да вытворчасці вельмі патрэбнай і самай мірнай сельскагаспадарчай (і не толькі) тэхнікі, натхняе на адказную і дзейсную працу. А атрыманыя навыкі, прафесійны вопыт спатрэбяцца ў жыцці, нават калі мы будзем працаваць па іншай спецыяльнасці.

## Дар'я ГАРАДКО і студэнцкі атрад «Матрос» імя Героя Савецкага Саюза Васіля Цымбала

На пляжах Беларусі працуюць студэнцкія атрады матросаў-ратавальнікаў.

— Абавязкі ў нас тыя ж, што і ў прафесійных супрацоўнікаў АСВОДа, — расказвае баец атрада «Матрос» Дар'я Гарадко. — Мы заклікаы прадухіляць няшчасныя выпадкі на вадзе. І ратаваць тых, хто пакутуе ад гэтай стыхіі.

Сама Даша — студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, з фізічнай падрыхтоўкай у яе ўсё добра, а спецыяльную дзяўчына прайшла ў АСВОД. Аб няшчасных выпадках на вадзе ведала аб з нечых слоў, або са зводак. Пакуль... Падчас аднаго з дзяжурстваў у поле зроку маладых ратавальніц Дар'і і яе напарніцы трапілі двое мужчын, якія вельмі шмат выпілі і знаходзіліся на самым краі берага воднага канала. У нейкі момант аднаму з іх стала дрэнна, і ён кулём зваліўся ў ваду. Не разважаючы Даша нырнула за ім. Пакуль калега выклікала падмогу, далікатная дзяўчына ўтрымлівала цела 120-кілаграмовага мужчыны так, каб яго галава была над вадой і ён не захлынуўся. Выцягнуць яго на бераг не змагла б фізічна. У гэты час падае ў ваду і другі выпівака. На шчасце, падмога прыйшла своечасова і абодвух мужчын выратавалі.

## Арцём ЧАРКОЎ і праект «Медыкус»

31 студатрадавец працаваў гэтым летам у Наваполацкай гарадской бальніцы, 21 — у Полацкай.

— Сёлета жаданне папрацаваць у складзе зводнага беларуска-расійскага студэнцкага атрада выказалі студэнты і навучэнцы каледжаў з Гомеля, Маладзечна, Слуцка, Гродна, — адзначае камісар Рэспубліканскага медыцынскага працоўнага праекта «Медыкус 2024» Арцём Чаркоў. — Да нас далучыліся будучыя медыкі з Расіі — Варонежа, Пскова, Чалябінска і Рэспублікі Татарстан. Байцы атрада працавалі на базе прыёмнага, неўралагічнага, хірургічнага, траўматалагічнага, тэрапеўтычнага, пульманалагічнага, педыятрычнага, інфекцыйнага аддзяленняў, а таксама ў анестэзіялогіі і рэанімацыі. Пасады яны атрымалі важныя і запатрабаваныя ў любой медыцынскай установе: медсясцёр, медбратоў і малодшага медыцынскага персаналу. І найважнейшае тое, што набылі неацэнны вопыт зносін з пацыентамі і навыкі догляду іх.

## Ксенія ХЛУСЕВІЧ і праект «Дарога магчымасцяў»

У 2024 годзе ў шматтысячную сям'ю беларускіх чыгуначнікаў уліліся 600 байцоў студэнцкіх атрадаў.

У свой час пры падтрымцы Цэнтральнага камітэта БРСМ на базе Дарожнага цэнтра па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў і прадпрыемстваў аддзяленняў чыгуначнай магістралі арганізавалі папярэдняе навучанне студэнтаў і навучэнцаў па прафесіях «Праваднік пасажырскага вагона» і «Манцёр пуці». Цяпер навучанне тут праходзяць не толькі студэнты чыгуначных спецыяльнасцяў. Другую кваліфікацыю могуць атрымаць тыя, хто вучыцца ва ўстановах адукацыі медыцынскага, педагагічнага, аграрнага, тэхнічнага і будаўнічага профіляў.

— Праваднікам пасажырскага вагона я працую другі год, — расказвае камандзір праваднічага атрада Рэспубліканскага галіновага міжпрофільнага праекта Ксенія Хлусевіч. — Мой маршрут — Мінск — Санкт-Пецярбург. Міф аб тым, што праца правадніка лёгкая і заключаецца ў тым, каб сабраць-раздаць квіткі, паўсміхацца, разнесці чай і пасцельную бялізну, разбіваецца аб рэальнасць цэлага шэрагу нюансаў. Гэта найперш работа з людзьмі: са сваімі характарамі, патрабаваннямі, у розным стане. З кожным трэба знайсці агульную мову. Першы год было вельмі цяжка. Цяпер я пачала атрымліваць задавальненне ад сваёй працы, бо ўсведамляю, у якое цудоўнае месца важу пасажыраў.

## Дыяна ВІКУЛІНА і праект «Атлант»

Праект сёлета працаўладкаваў 260 чалавек.

— З прадпрыемствам мы працуем трэці год, — расказвае камандзір Маладзёжнага працоўнага праекта «Атлант 2024» Дыяна Вікуліна. — Гэтым супрацоўніцтвам, па-мойму, задаволены ўсе: і наймальнік, і студатрадаўцы. Першы — вынікамі нашай працы, другія — годнай заработнай платай і ўмовамі працы. Нашы байцы вельмі стараліся, нават выходзілі ў другую змену, бо было шмат заказаў.

Стала вядома, што кіраўніцтва «Атланта» звярнулася ў Цэнтральны камітэт БРСМ з прапановай прадоўжыць праект і восенню. А значыць, моладзь сябе сапраўды добра зарэкамендавала.

Нагадаем, што перш чым заняць сваё месца на канвееры, каля станка ці ў вагоне пасажырскага цягніка, хлопцы і дзяўчаты праходзілі навучанне і атрымалі на рукі дакумент аб наяўнасці той ці іншай спецыяльнасці. Які б шлях яны ні абралі далей, і новая спецыяльнасць, і атрыманы досвед будуць у іх жыцці добрым бонусам.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота са свабодных крыніц і 1prof.by.**

*Абмяркуем*

# ШТО СУЧАСНАЯ МЕДЫЯПРАСТОРА НАМ РЫХТУЕ?

Шмат студэнтаў журфака (і не толькі) мараць стаць медыйнымі, стварыць свой папулярны і значны рэсурс на абшарах глабальнай сеткі. Але як гэтага дабіцца ў XXI стагоддзі, калі ствараецца адчуванне, нібы ўсе нішы ўжо занятыя. Рукі, вядома, апускаць не варта, бо многія сумневы — усяго толькі страхі і стэрэатыпы, якія нам дапамагла развеяць шэф-рэдактар расійскага медыяхолдынга «Рядовка» Ксенія Міронава падчас стратэгічнай сесіі-сустрэчы ў рамках XVII фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву».



## Поспех — толькі ў мегаполісе?

Вядома, гэта не так. Сама «Рядовка» пачынала ў 2011 годзе з невялікага пабліка «УКантакце» аб рэгіянальных навінах Смаленска. А ўжо ў 2017 годзе ў іх з'явіўся федэральны сайт, які з таго часу асвятляе падзеі ў Расіі і свеце. Асноўнай пляцоўкай стаў ТГ-канал «Readovka», які сёння мае больш за 2,7 мільёна падпісчыкаў.

— Няма меж, і ўсё роўна, з якога ты горада ці краіны. Нават жыхары зусім маленькага пасёлка могуць дасягнуць шмат у медыясяроддзі дзякуючы сваёй упартасці. Увогуле, пара ўключаць галаву і ісці скараць вяршыні, — заключыла Ксенія Міронава.

Па словах эксперта, сёння Telegram — самая актуальная пляцоўка, на якой могуць працаваць як журналісты, так і іншыя аўтары.

— Сакрэт яго папулярнасці — у зручнасці. Ёсць тры складнікі поспеху, якія дае гэтая пляцоўка для журналістаў і аўтараў любога кантэнту: хуткасць, прастата і рэакцыя. Мы, дзякуючы Telegram, сталі вельмі хутка атрымліваць навіны. Аўдыторыя гэтым ужо вельмі распешчаная, і пакуль іншых аналагаў няма.

Аднак у сучасным свеце заўсёды варта трымаць руку на пульсе.

— Апошнія падзеі з затрыманнем Паўла Дурава ў Францыі кажуць аб тым, што, магчыма, нас будуць чакаць некаторыя змены. Але час пакажа, — дадала журналістка.

## З чаго пачаць?

Найперш, вельмі важна вызначыцца з тэматыкай. Так, калі ты хочаш весці ТГ-канал пра падарожжы, то абавязкова павінна быць разыначка, якая б адрознівала яго ад канкурэнтаў. А далей — праца, праца і яшчэ раз праца.

— Нельга прападаць. Кожны дзень выпускайце хоць бы адну публікацыю. Гэта вельмі важна на пачатковым этапе, — дзеліцца Ксенія Міронава. — Калі казаць аб аўдыторыі, то для пачатку дадайце туды ўсіх вашых сяброў, блізкіх, знаёмых. Так вы будзеце адчуваць, што ёсць для каго працаваць. Калі на канале дзесяць падпісчыкаў, то, напэўна, не хочацца кожны дзень туды нешта пісаць і ўкладаць сілы.

Пасля таго як набярэцца прыкладна 500 падпісчыкаў, можна пазнаёміцца з аўтарамі ТГ-каналаў сумежнай тэматыкі.

— Напрыклад, калі вы захацелі зрабіць ТГ-канал аб горадзе, то знаходзьце іншых, хто асвятляе падобную тэму, і проста пішыце ім з прапановай пазнаёміцца. Я вас запэўніваю, з дзесяці чалавек можа адзін адмовіцца, але ўсе астатнія захочуць супрацоўнічаць, таму што гэта ўсім цікава, — распавяла Ксенія Міронава. — Вось так набіраеце кола знаёмстваў у медыясяроддзі і дамаўляйцеся для пачатку аб узаемным піяры. Яны рэпосцяць вашу публікацыю, а вы — іх альбо робіце рэкламны пост, але бясплатны, пакуль у вас невялікая аўдыторыя.

Дзякуючы ўзаемнаму піяру канал абавязкова будзе расці і ў нейкі момант дойдзе да такіх значэнняў, што можна будзе замаўляць рэкламу ў тых ТГ-каналаў, якія вам падабаюцца, на платнай аснове.

— Галоўнае — праверыць, каб там была жывая аўдыторыя. Для гэтага трэба звярнуць увагу на каментарыі і на статыстыку ў ТГ-стаце, — нагадала медыяэксперт.

## Чым зачапіць аўдыторыю і дзе знайсці натхненне?

На думку Ксеніі Міронавай, найбольш запатрабаваны сярод падпісчыкаў гучныя сітуацыі экстраннага характару і сацыяльная несправядлівасць.

— У першым выпадку гэта тэрміновая неабходнасць атрымання інфармацыі. Таму, дарэчы, падчас розных надзвычайных падзей вельмі моцна растуць ТГ-каналы, падпісваецца велізарная колькасць людзей, якія становяцца вашай пастаяннай аўдыторыяй. У другім выпадку чапляе тое, што вы захочаце заступіцца за чалавека, да якога па нейкіх прычынах несправядліва ставяцца: пазбаўляюць дому, не аказваюць медыцынскую дапамогу і гэтак далей.

Наконт натхнення журналістка з усмешкай адказала, што шукаць гэты стан не заўсёды выпадае магчымасць.

— Мы вельмі шмат працуем. Я параўнала б нас з такім цягніком, які прабівае ўсе сцены, таму што вельмі высокія патрабаванні. Журналістыка, вядома, — творчая работа, але ў першую чаргу гэта ўнутраны матор ва ўсіх, хто ў вашай камандзе.

Яшчэ многіх цікавіла пытанне, якое месца займае штучны інтэлект у сучаснай журналістыцы. Гэтая тэма апошнім часам становіцца ўсё больш актуальнай. Так, у «Рядовке» штучны інтэлект выкарыстоўваюць дызайнеры.

— Нешта адмалёўваюць уручную, недзе дапамагае штучны інтэлект, і яны ў такой цеснай звязцы працуюць. Дзякуючы гэтаму, мы набіраем хуткасць. Тое, на што ў дызайнераў сышло б некалькі дзён, штучны інтэлект робіць за хвіліны, — адзначыла Ксенія Міронава.

Аднак тэксты пішуць толькі жывыя людзі. Па словах журналісткі, яны выдатна спраўляюцца са сваімі задачамі і ў дапамозе штучнага інтэлекту в дадзены момант не бачаць неабходнасці.

— Зыходзячы з таго, што я бачу ў медыяпрасторы аб штучным інтэлекце, думаю, калісьці гэта пракрадзецца ва ўсе сферы нашага жыцця. Вось у нашым медыяхолдынгу гэта паволі перацякло ў аддзел дызайнераў, але я не ўпэўнена, што на тым усё скончыцца. Таму я была б уважлівай і абавязкова вывучала ўсе моманты, звязаныя са штучным інтэлектам, — падсумавала журналістка.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

*Фотафакт*

# ЯРКІЯ ІМГНЕННІ ФЕСТЫВАЛЮ

Пяць насычаных дзён правялі ўдзельнікі XVII Фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» ў Смаленску з 11 да 15 верасня. Конкурсы, дзелавыя сустрэчы, новыя знаёмствы, экскурсіі і канцэрты... Усё гэта стварыла неверагодную атмасферу свята і сяброўства для юных артыстаў.



Паводле слоў **намесніка старшыні Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па маладзёжнай палітыцы, спорце і турызме Сяргея КЛІШЭВІЧА,** фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» — гэта паспяховы прыклад маладзёжнай народнай дыпламатыі, што з'яўляецца фундаментам для палітыкі, эканомікі і іншых сфер.

— Асаблівая калі гаворка ідзе аб моладзі, гэта значыць, аб тых юнаках і дзяўчатах, якія ў будучыні будуць кіраваць нашымі краінамі, таму важна ўжо сёння іх згуртаваць, каб яны разумелі каштоўнасць сяброўства паміж нашымі народамі і працягвалі добрыя традыцыі мірасуседства, якія заклалі нашы продкі, — адзначыў ён.

Сёлета фестываль меў навоўведзенні. Апроч вакальнага правялі яшчэ і харэаграфічны конкурс, на якім прадстаўлялі народны, эстрадны танцы, а таксама сучасную харэаграфію. Акрамя гэтага, вялікую ўвагу ўдзялілі патрыятычнаму складніку маштабнага мерапрыемства і ўпершыню правялі форум маладых гісторыкаў Саюзнай дзяржавы. Экскурсія па горадзе для беларускай дэлегацыі таксама стала прыемным сюрпрызам і магчымасцю даведацца шмат новага пра Смаленск, паглядзець на яго з вышыні Саборнай гары і наведаць жамчужыну горада — Свята-Успенскі кафедральны сабор.

Вядома, галоўная інтрыга фестывалю раскрылася на гала-канцэрце закрыцця. Менавіта там сталі вядомыя пераможцы конкурсу выканаўцаў маладзёжнай песні і конкурсу харэаграфічных калектываў. У вакальным выпрабаванні званне лаўрэата і дыплом першай ступені атрымалі Ангеліна Самалётава з Беларусі і Аляксандр Несцераў з Расіі.



Што да міжнароднага конкурсу харэаграфічных



калектываў, то ў намінацыі «Народна-сцэнічны танец, стылізацыя народнага танца» Гран-пры і магчымасць паўдзельнічаць у «Славянскім базары ў Віцебску» атрымалі заслужаны калектыў народнай творчасці Расійскай Федэрацыі ансамбль танца «Ералаш» і ўзорны мастацкі калектыў харэаграфічны ансамбль «Фолія». А званне лаўрэата першай ступені ўдастоены заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца «Белая Русь» і заслужаны аматарскі калектыў узорны ансамбль народнага танца «Чабарок».

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.802.
Нумар падпісаны ў 19.30 25.09.2024 г.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества частного торгового унитарного предприятия «ЗападХимТорг»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3034-4, кузов (рама) № VF18SRPL464049346, 2019 г. вып. | 37260,00 | 3726,00 | 1863,00 |
| 2 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3045-4, кузов (рама) № VF18SRPL464049361, 2019 г. вып. | 36072,00 | 3607,20 | 1803,60 |
| 3 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3053-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041494, 2019 г. вып. | 36828,00 | 3682,80 | 1841,40 |
| 4 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3062-4, кузов (рама) № VF18SRPL464028009, 2019 г. вып. | 38232,00 | 3823,20 | 1911,60 |
| 5 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3068-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041500, 2019 г. вып. | 37692,00 | 3769,20 | 1884,60 |
| 6 | Грузовой вагон (WAGON) RENAULT MASTER, рег. № АМ 3587-4, кузов (рама) № VF1MAFZSC63777121, 2019 г. вып. | 92988,00 | 9298,80 | 4649,40 |
| 7 | Грузовой вагон (WAGON) RENAULT MASTER, рег. № АМ 3602-4, кузов (рама) № VF1MAFZSC63777147, 2019 г. вып. | 93744,00 | 9374,40 | 4687,20 |
| 8 | Грузовой вагон (WAGON) RENAULT MASTER, рег. № АМ 3604-4, кузов (рама) № VF1MAFZSC63777146, 2019 г. вып. | 91368,00 | 9136,80 | 4568,40 |
| 9 | Грузовой вагон (WAGON) RENAULT MASTER, рег. № АМ 3613-4, кузов (рама) № VF1MAFZSC63777145, 2019 г. вып. | 96876,00 | 9687,60 | 4843,80 |
| 10 | Грузовой вагон (WAGON) RENAULT MASTER, рег. № АМ 3616-4, кузов (рама) № VF1MAFZSC63777133, 2019 г. вып. | 92988,00 | 9298,80 | 4649,40 |
| 11 | Грузовой вагон (WAGON) RENAULT MASTER, рег. № АМ 3638-4, кузов (рама) № VF1MAFZSC63802865, 2019 г. вып. | 94500,00 | 9450,00 | 4725,00 |
| 12 | Грузовой вагон (WAGON) RENAULT MASTER, рег. № АМ 3646-4, кузов (рама) № VF1MAFESC63629826, 2019 г. вып. | 98064,00 | 9806,40 | 4903,20 |
| 13 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) PEUGEOT BOXER, рег. № АМ 3628-4, кузов (рама) № VF3YCTMFC12L38807, 2019 г. вып. | 74952,00 | 7495,20 | 3747,60 |
| 14 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) PEUGEOT BOXER, рег. № АМ 3713-4, кузов (рама) № VF3YDTMFC12N48044, 2020 г. вып. | 89532,00 | 8953,20 | 4476,60 |
| 15 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) PEUGEOT BOXER, рег. № АМ 3725-4, кузов (рама) № VF3YDTMFC12N58917, 2020 г. вып. | 89532,00 | 8953,20 | 4476,60 |
| 16 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) PEUGEOT BOXER, рег. № АМ 3726-4, кузов (рама) № VF3YCTMFC12N48564, 2020 г. вып. | 95256,00 | 9525,60 | 4762,80 |
| 17 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) PEUGEOT BOXER, рег. № АМ 3727-4, кузов (рама) № VF3YCTMFC12L38725, 2019 г. вып. | 78624,00 | 7862,40 | 3931,20 |
| 18 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) PEUGEOT BOXER, рег. № АМ 3751-4, кузов (рама) № VF3YCTMFC12L37035, 2019 г. вып. | 77004,00 | 7700,40 | 3850,20 |
| 19 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) PEUGEOT BOXER, рег. № АМ 8568-4, кузов (рама) № VF3YCTMFC12N40514, 2020 г. вып. | 95256,00 | 9525,60 | 4762,80 |
| 20 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) PEUGEOT BOXER, рег. № АМ 8563-4, кузов (рама) № VF3YDTMFC12M59294, 2019 г. вып. | 73764,00 | 7376,40 | 3688,20 |
| 21 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) CITROEN JUMPER, рег. № АМ 3743-4, кузов (рама) № VF7YDTMFC12M26142, 2019 г. вып. | 74088,00 | 7408,80 | 3704,40 |
| 22 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 4924 НА-4, кузов (рама) № XW8AT4NH8MK124243, 2021 г. вып. | 44604,00 | 4460,40 | 2230,20 |
| 23 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 4945 НА-4, кузов (рама) № XW8AT4NH6MK124029, 2021 г. вып. | 49032,00 | 4903,20 | 2451,60 |
| 24 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 5016 МТ-4, кузов (рама) № XW8AT4NH7MK113721, 2020 г. вып. | 43524,00 | 4352,40 | 2176,20 |
| 25 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 7144 МС-4, кузов (рама) № XW8AT6NH9MK105079, 2020 г. вып. | 45684,00 | 4568,40 | 2284,20 |
| 26 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 7166 МС-4, кузов (рама) № XW8AT6NH4MK102784, 2020 г. вып. | 43524,00 | 4352,40 | 2176,20 |
| 27 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 7167 МС-4, кузов (рама) № XW8AT6NH0MK108498, 2020 г. вып. | 44928,00 | 4492,80 | 2246,40 |
| 28 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 7170 МС-4, кузов (рама) № XW8AT6NH6MK103550, 2020 г. вып. | 46440,00 | 4644,00 | 2322,00 |
| 29 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 8290 МС-4, кузов (рама) № XW8AT4NH4MK111246, 2020 г. вып. | 45684,00 | 4568,40 | 2284,20 |
| 30 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 8307 МС-4, кузов (рама) № XW8AT4NH6MK111166, 2020 г. вып. | 46440,00 | 4644,00 | 2322,00 |
| 31 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) SKODA RAPID, рег. № 8345 МС-4, кузов (рама) № XW8AT6NH5MK111431, 2020 г. вып. | 44280,00 | 4428,00 | 2214,00 |
| 32 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) RENAULT ARKANA, рег. № 7100 МС-4, кузов (рама) № X7LRJC2D065973927, 2020 г. вып. | 44280,00 | 4428,00 | 2214,00 |
| 33 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) RENAULT ARKANA, рег. № 7455 МР-4, кузов (рама) № X7LRJC2DX64007087, 2019 г. вып. | 44712,00 | 4471,20 | 2235,60 |
| 34 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) RENAULT ARKANA, рег. № 7456 МР-4, кузов (рама) № X7LRJC2D764027880, 2019 г. вып. | 42660,00 | 4266,00 | 2133,00 |
| 35 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) RENAULT ARKANA, рег. № 7464 МР-4, кузов (рама) № X7LRJC2D464007084, 2019 г. вып. | 45468,00 | 4546,80 | 2273,40 |
| 36 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) RENAULT ARKANA, рег. № 7465 МР-4, кузов (рама) № X7LRJC2D264007150, 2019 г. вып. | 42660,00 | 4266,00 | 2133,00 |
| 37 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) RENAULT ARKANA, рег. № 7476 МР-4, кузов (рама) № X7LRJC2D164027910, 2019 г. вып. | 44712,00 | 4471,20 | 2235,60 |
| 38 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) RENAULT ARKANA, рег. № 8154 МР-4, кузов (рама) № X7LRJC2D264006628, 2019 г. вып. | 43308,00 | 4330,80 | 2165,40 |
| 39 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) RENAULT ARKANA, рег. № 8178 МР-4, кузов (рама) № X7LRJC2D964006285, 2019 г. вып. | 42012,00 | 4201,20 | 2100,60 |
| 40 | Легковой автомобиль ХЭТЧБЕК (HATCHBACK) RENAULT ARKANA, рег. № 8322 МС-4, кузов (рама) № X7LRJC2D765973908, 2020 г. вып. | 45468,00 | 4546,80 | 2273,40 |
| 41 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3600-4, кузов (рама) № VF18SRPL463766913, 2019 г. вып. | 35424,00 | 3542,40 | 1771,20 |

В отношении лотов №№ 1–40 проводятся первые повторные торги.
В отношении лота № 41 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.**
Ранее публикации размещались в газете «Звязда» № 163 (30297) от 22.08.2024, стр. 14; № 177 (30311) от 11.09.2024, стр. 12

В отношении лотов №№ 1–5, 33–36 имеется ограничение (обременение) в виде залога (залогодержатель – ОАО «Технобанк»).
В отношении лотов имеется временное ограничение на снятие транспортных средств с учета.
Подробнее по тел. +375293650697 (Екатерина)

**Местонахождение лотов:** г. Минск, ул. Калиновского, 117

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **9 октября 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 26 сентября 2024 года до 16.00 7 октября 2024 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», частное предприятие «ЗападХимТорг», проводимых 09.10.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1–5, 22–41 – 6 %, по лотам №№ 6-21 – 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. **По вопросу ознакомления – Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 365-06-97 (Екатерина) (231335, Гродненская область, Ивьевский район, с/с Липнишковский, аг. Липнишки, ул. Виленская, д. 12А корпус 1, ком. 6, УНП 590828925)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

КРАЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Логойский район, Крайский сельсовет, д. Белое, ул. Центральная, д. 25, имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме:**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6х9 м.

Площадь: 47,9 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: информация отсутствует.

Материал стен: дерево.

Этажность: одноэтажный.

Подземная этажность: отсутствует.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: ОАО «Нестановичи-Агро». Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 3 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Крайский сельский исполнительный комитет не поступало уведомлений о намерении использовать дом для проживания.

Крайский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения в связи с тем, что правообладатели неизвестны или неизвестно место их фактического проживания либо местонахождение, уведомить Крайский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Наш адрес: **223138, аг. Крайск, ул. Буденного, 8, Логойский район, Минская область. Электронный адрес: kraysk@logoysk.gov.by.**

**Телефоны для справок: 80177473636, 73635.**

УНП 600181643

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

КРАЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Логойский район, Крайский сельсовет, д. Заполье, д. 4, имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме:**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 5х7 м.

Площадь: 29 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1950 г.

Материал стен: дерево.

Этажность: одноэтажный.

Подземная этажность: отсутствует.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: ОАО «Нестановичи-Агро». Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 3 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Крайский сельский исполнительный комитет не поступало уведомлений о намерении использовать дом для проживания.

Крайский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения в связи с тем, что правообладатели неизвестны или неизвестно место их фактического проживания либо местонахождение, уведомить Крайский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Наш адрес: **223138, аг. Крайск, ул. Буденного, 8, Логойский район, Минская область. Электронный адрес: kraysk@logoysk.gov.by.**

**Телефоны для справок: 80177473636, 73635.**

УНП 600181643

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

КРАЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Логойский район, Крайский сельсовет, д. Троянец, д. 23, имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме:**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6х9 м.

Площадь: сведения отсутствуют.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: сведения отсутствуют.

Материал стен: дерево.

Этажность: одноэтажный.

Подземная этажность: отсутствует.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: ОАО «Нестановичи-Агро». Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 3 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Крайский сельский исполнительный комитет не поступало уведомлений о намерении использовать дом для проживания.

Крайский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения в связи с тем, что правообладатели неизвестны или неизвестно место их фактического проживания либо местонахождение, уведомить Крайский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Наш адрес: **223138, аг. Крайск, ул. Буденного, 8, Логойский район, Минская область. Электронный адрес: kraysk@logoysk.gov.by.**

**Телефоны для справок: 80177473636, 73635.**

УНП 600181643

# БЕСПАКАРАНАСЦЬ СПАРАДЖАЕ ЎСЁДАЗВОЛЕНАСЦЬ



## Да чаго можа прывесці «тэхнічны апакаліпсіс» у Ліване

**17 верасня 2024 года ў гісторыю Блізкага Усходу была ўпісана чарговая крывавая старонка. І калі раней асноўнай крыніцай пагрозы выступала войска Ізраіля і яго дзейнасць у рэгіёне, то сёння такімі сталі прылады сувязі, бытавая тэхніка і электронныя гаджэты. Больш за 4 тысячы пацярпелых, дзясяткі забітых, сотні скалечаных у Ліване і Сірыі — вось вынік міжнароднага тэрарыстычнага акта, ажыццёўленага ізраільскімі спецслужбамі. Сусветныя СМІ паведамілі аб здарэнні, аднак досыць хутка навіна перайшла з разраду экстранных у пералік звычайных, паколькі гібель людзей у гэтым рэгіёне — норма для заходніх краін.**

Разберомся ў сутнасці таго, што адбылося. Па даных агенцтва Reuters, выбухі адбываліся прыкладна з 15:30 па мясцовым часе (16:30 мск) і працягваліся на працягу гадзіны ў розных рэгіёнах Лівана, у тым ліку на поўдні краіны і ў сталіцы — Бейруце. Узрываліся мабільныя пэйджары, рацыі, аўтамабільныя радыёпрыёмнікі, гарэлі скутары і сістэмы бяспекі дамоў, уключаючы дамафоны. У Ліване гэта назвалі «тэхнічным апакаліпсісам», а ўлады краіны парэкамендавалі ўсім, у каго ёсць любыя прылады з літыевай батарэяй — а гэта ўсё віды гаджэтаў, у тым ліку ноўтбукі і камп'ютары, бытавыя электрапрыборы, — неадкладна іх адключыць і блізка да тэхнікі не набліжацца.

Акрамя таго, з'явілася інфармацыя аб тым, што некалькі дзясяткаў падрываў было зафіксавана на тэрыторыі Сірыі, а прэзідэнт аддаў загад усім камандзірам адмовіцца ад выкарыстання радыёстанцый і партатыўных прылад сувязі. Большасць пацярпелых з'яўляліся членамі палесцінскай арганізацыі «Хезбала», аднак сярод параненых і забітых былі дзясяткі цывільных асоб і дзяцей.

Паводле інфармацыі Reuters, аналіз відэазапісаў з месцаў здарэння паказаў, што пэйджары дэтанавалі пасля паступлення на іх інфармацыі з часовай затрымкай. У той момант, калі ўладальнікі прылад бралі іх у рукі, каб прачытаць інфармацыю. Гэта стала вынікам шырокага распаўсюджвання выбуховых траўм галавы, органаў зроку і канечнасцяў. Скупыя інфармацыйныя радкі ніякім чынам не могуць перадаць болю і пакут людзей, якія сталі аб'ектамі гэтага масавага тэрарыстычнага акта. Тысячы пацярпелых, пакалечаных, дзясяткі забітых — вынік, які дасягнуты падчас подлай атакі. Па інфармацыі канала Al-Hadath, каля 500 чалавек страцілі зрок.

Не выклікае сумнення, што такі масавы, высокатэхналагічны, сінхронна рэалізаваны ўдар — гэта вынік усебакова падрыхтаванай спецыяльнай аперацыі, ажыццявіць якую ў рэгіёне здольны толькі Ізраіль. Тым больш што яўрэйская дзяржава актыўна выкарыстоўвае дыверсійныя і нават тэрарыстычныя метады для вырашэння ўласных задач, ігнаруючы любыя правілы вайны.

Па ацэнцы Ронена Бергмана, аўтара кнігі «Паўстань і забі першым: таемная гісторыя ізраільскіх кропкавых ліквідацый», з Другой сусветнай Ізраіль забіў людзей больш, чым любая іншая краіна Заходняга лагера, — нават у першым дзесяцігоддзі XXI стагоддзя, калі ЗША актыўна звярталіся да кропкавых забойстваў у ходзе канфліктаў на Блізкім Усходзе.

Нярэдка для ліквідацыі ізраільскія спецслужбы выкарыстоўвалі выбуховыя прыстасаванні. Прычым спосаб дастаўкі мог быць самым розным. У снежні 1988 года ў аперацыі, мэтай якой быў кіраўнік Народнага фронту вызвалення Палесціны Ахмад Джыбрыль, Армія абароны Ізраіля выкарыстоўвала спецыяльна навучанага сабаку, на спіне якога было замацавана выбуховае прыстасаванне з дыстанцыйна кіраваным узрывальнікам. Аднак акцыя не была паспяховай.

У студзені 1996 года Ізраіль правёў аперацыю па ліквідацыі Яхія Айяша, лідара «Брыгады Аль-Касам» — ваеннага крыла ХАМАС. 50 г узрывчаткі і дыстанцыйны дэтанатар былі ўстаноўлены ў тэлефон у доме яго сябра дзяцінства, а план забойства рэалізаваны падчас размовы Айяша з уласным бацькам. З тых часоў арабскія рухі адмовіліся ад выкарыстання мабільных тэлефонаў як ад сродку павышанай небяспекі.

Падрыў аб'екта стаў адным з упадабаных прыёмаў ізраільскіх спецслужбаў для зрыву рэалізацыі іранскай ядзернай праграмы. У студзені 2010 года ў Тэгеране быў забіты адзін з вядучых фізікаў Масуд Алі Махамадзі — узарваўся замініраваны матацыкл, прыпаркаваны каля яго аўтамабіля. У лістападзе таго ж года былі ўчынены напады на двух вучоных-ядзершчыкаў — Маджыда Шахрыяры і Ферэйдуна Абасі-Давані. Забойцы прымацавалі бомбы да машын фізікаў, у выніку чаго першы загінуў, а другі цудам застаўся жывы.

Не менш эфектыўна Ізраіль выкарыстоўваў свой тэхналагічны задзел для аперыравання ў кіберпрасторы. У канцы 2010 года ўпершыню ў сусветнай практыцы вірус «Стакснет» быў задзейнічаны ў якасці кіберзброі, а наступствы яго прымянення насілі катастрафічны характар для ядзернай праграмы Ірана.

У другім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя стратэгіі дзеянняў у кіберпрасторы распрацавалі большасць вядучых дзяржаў свету, у тым ліку Ізраіль. У якасці асноўнай формы барацьбы ў ёй разглядаецца аперацыя, якая вызначаецца як сукупнасць узгодненых і ўзаемазвязаных па мэце, задачах, месцы і часе інфармацыйных уздзеянняў на аб'екты дзяржаўнага або ваеннага прызначэння праціўніка, якія праводзяцца па адзінай задуме і плане як у мірны, так і ў ваенны час. Асноўным аб'ектам уздзеяння з'яўляюцца камп'ютарныя сеткі і электронныя прылады, а праграмныя і тэхнічныя сродкі, якія прымяняюцца для гэтага, названы кіберзброяй.



**У другім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя стратэгіі дзеянняў у кіберпрасторы распрацавалі большасць вядучых дзяржаў свету, у тым ліку Ізраіль. У якасці асноўнай формы барацьбы ў ёй разглядаецца аперацыя, якая вызначаецца як сукупнасць узгодненых і ўзаемазвязаных па мэце, задачах, месцы і часе інфармацыйных уздзеянняў на аб'екты дзяржаўнага або ваеннага прызначэння праціўніка, якія праводзяцца па адзінай задуме і плане як у мірны, так і ў ваенны час. Асноўным аб'ектам уздзеяння з'яўляюцца камп'ютарныя сеткі і электронныя прылады, а праграмныя і тэхнічныя сродкі, якія прымяняюцца для гэтага, названы кіберзброяй.**

У адпаведнасці з рэйтынгам, апублікаваным кампаніяй Zecurion Analytics у 2017 годзе, Тэль-Авіў валодаў групоўкай спецыялістаў-хакераў, якая перавышае 1000 чалавек, і не варта спадзявацца, што іх колькасць паменшылася. Характэрна, што ў канцэпцыях большасці развітых краін, уключаючы ЗША, кібератака заканадаўча прыраўнавана да ўзброенага нападу і замацавана права нанясення рэальнага ўдару ў адказ.

Разам з тым не выклікае сумнення, што заява, апублікаваная ўрадам Лівана па слядах масавага замаху на забойства ўласных грамадзян, які «самым рашучым чынам асудзіў ізраільскую кібератаку, што прывяла да масавых выбухаў», застанецца без асаблівай увагі міжнароднай грамадскасці.

Апеляванне да міжнародных арганізацый і ААН з канстатацыяй таго, што «забойны напад Ізраіля з'яўляецца сур'ёзным парушэннем суверэнітэту Лівана і злачынствам ва ўсіх сэнсах», а таксама заклік «забяспечыць яго расследаванне», будуць пахаваны сістэмнай бюракратыяй.

Тым больш што пачатак гэтаму працэсу пакладзены. Прадстаўнік Дзяржздэпартамента ЗША Мэцью Мілер запэўніў журналістаў, што ў Вашынгтоне нічога не ведалі аб нападзе, які планаваўся. Ён нават асудзіў напад на мірных грамадзян, якія пацярпелі ў выніку серыі выбухаў. Але пры гэтым адзначыў, што члены «тэрарыстычных арганізацый» з'яўляюцца «законнымі мэтамі» для краін, якія змагаюцца з падобнымі рухамі.

Захоўвае маўчанне і Ізраіль, які неаднаразова абяцаў «пашырыць вайну на тэрыторыю Лівана». Ускосным пацвярджэннем яго прамога ўдзелу ў дадзеным тэрарыстычным акце з'яўляецца інфармацыя аб тым, што ў аўторак, 17 верасня, Нетаньяху і міністр абароны Ізраіля Ёаў Галант некалькі гадзін правялі ў камандным цэнтры ЦАХАЛ у Тэль-Авіве. Да гэтага ў панядзелак на пасяджэнні кабміна ізраільскі прэм'ер паведаміў аб рашэнні «абнавіць мэты вайны». Па словах ізраільскіх чыноўнікаў, гаворка ішла аб пераключэнні ўвагі Ізраіля з сектара Газа, дзе ўжо забіты больш за 40 тысяч палесцінцаў, на ліванскі напрамак.

Больш за тое, паводле інфармацыі крыніцы агенцтва Axios, ізраільская аперацыя была накіравана на падрыў даверу ўнутры «Хезбалы» і стварэнне ў шэрагах руху адчування, што ён знаходзіцца пад кантролем ізраільскіх спецслужбаў. Пры гэтым Axios сцвярджае, што за некалькі хвілін да дэтанацыі пэйджараў міністр абароны Ізраіля звязваўся з кіраўніком Пентагона Осцінам Лойдам і нібыта паведамляў яму пра падрыхтоўку аперацыі, але без канкрэтызацыі дэталяў.

Аднак Вашынгтон агучыў сваю пазіцыю. Ліван — гэта ж не ЗША і не краіны заходняга свету, дзе воляй тых, хто мае ўладу, гібель аднаго чалавека становіцца трагедыяй або не заўважаецца. Гэта краіна трэцяга свету, дзе смерць тысяч — толькі статыстыка.

Ужо сёння ў большасці публікацый на тэму ліванскіх выбухаў акцэнты перамяшчаюцца ў бок тэхналогіі рэалізацыі дадзенага «сінхроннага падрыву». Журналістаў больш цікавіць не сутнасць здарэння і хто за гэтым стаіць, а пытанне: як удалося замініраваць 5000 тысяч пэйджараў і тэхналагічна выверана іх падарваць? Упор робіцца на марку пэйджараў, якія выбухнулі, — Gold Apollo AR924 і іх тайваньскае паходжанне.

Асобныя аглядальнікі ідуць яшчэ далей, заяўляючы аб тым, што здэтанаваныя прылады былі выпушчаны еўрапейскай кампаніяй BAC Consulting, у якой ёсць адпаведная ліцэнзія на выкарыстанне брэнда, а вытворчасць знаходзіцца ў Венгрыі. Пры гэтым толькі мімаходзь згадваецца, што фірма створана ізраільскімі спецслужбамі, а прылады выраблялі вайсковыя інжынеры-электроншчыкі, укладваючы ў кожныя 1-2 унцыі (28-56 г) выбуховага рэчыва і адпаведнае электронна-праграмнае начынне.

За дужкамі застаюцца жыцці, лёсы і здароўе людзей і іх блізкіх. Усё спісваецца на дзесяцігоддзі супрацьстаяння ізраільцян і арабскага свету. Пры гэтым ЗША з'яўляюцца надзейным партнёрам і спонсарам Ізраіля, традыцыйна апраўдваючы любыя яго дзеянні, у тым ліку забойства нявінных людзей. Колькі электронных прылад з сюрпрызам яшчэ выкарыстоўваецца ў свеце — загадка са шматлікімі невядомымі, рашэнне якой — адкладзеная смерць уладальніка.

Выклікае занепакоенасць не сам факт масавых падрываў, а сусветная тэндэнцыя выкарыстання ў рамках міждзяржаўнага ўзброенага супрацьстаяння тэрарыстычных метадаў. Гэта становіцца штодзённасцю з боку Ізраіля і Украіны, не выключаючы асуджэння сусветнай супольнасці. Трансгранічны тэрарызм на камунікацыях, на тэрыторыі сумежных дзяржаў, апераванне ў кіберпрасторы і інфармацыйнай сферы — сучасная рэальнасць, якая патрабуе ўдакладнення пытанняў забеспячэння ваеннай бяспекі ў глабальным плане.

Што датычыцца «кропкавых ліквідацый», то ў гэтым сегменце Амерыка наперадзе планеты ўсёй. Светач дэмакратыі ніколі не спыняўся перад забойствам не толькі замежных палітычных і ваенных дзеячаў, але і ўласных прэзідэнтаў. Працягваецца гэтая практыка і сёння ў рамках чарговай электаральнай кампаніі. Кандыдат у прэзідэнты Дональд Трамп перажыў ужо два замахі, што будзе далей — пакажа час, аднак амерыканскія палітыкі рознага калібру на поўным сур'ёзе заклікаюць да яго забойства.

Сёння гэты прыём ліквідацыі непажаданых асоб шырока праецыруецца на Афрыку, Азію, Паўднёвую Амерыку і Еўропу. Свежы прыклад — спроба забойства славацкага прэм'ера Фіца. Прасоўваецца ён і ў шэрагах беларускіх «збеглых», якія мэтанакіравана падштурхоўваюць да тэрору і гвалту супраць кіраўніцтва краіны і суайчыннікаў. Забойства Прэзідэнта ў іх сістэме каардынат — гэта не злачынства, а рэальны план дзеянняў.

Не выклікае сумнення, што чарада выбухаў у Ліване прывядзе да новай эскалацыі на лівана-ізраільскай мяжы і адкладзе ў доўгую скрыню мірнае пагадненне Ізраіля з рухам ХАМАС па сектары Газа. Нельга выключаць, што блізкаўсходняе супрацьстаянне выйдзе на зусім новы тэхналагічны ўзровень. Бо асаблівасцю віртуальнай прасторы з'яўляецца практычна поўная ананімнасць удзельнікаў, а беспакаранасць спараджае ўсёдазволенасць і ігнараванне ўсякіх чалавечых норм. Калі вайна павінна працягвацца, то заўсёды можна знайсці або стварыць неабходную нагоду.

У гэтых умовах чарговы раз успамінаеш пра тэхналагічны і навуковы суверэнітэт, якія дазваляюць вырабляць уласныя электронныя прылады без смяротнага начыння, распрацоўваць айчынныя сістэмы абароны і сучасную тэхніку для патрэб людзей. Пачынаеш асабліва востра цаніць мірнае неба над галавой, спакой на вуліцах, бяспеку блізкіх і саму магчымасць жыць у камфортнай і добрай краіне — роднай Беларусі. Каб гэта працягвалася і надалей, мы павінны быць моцнымі, не забываць аб тым, што «бяда прыходзіць туды, дзе ёй адчыняюць дзверы».

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, прафесар.**

# Два ў адным

## АБ'ЁМЫ ЎРАЖВАЮЦЬ

«Калі казаць пра аб'ём вытворчасці ў натуральным вылічэнні, то з 2000 года выраблена больш за 385 тысяч грузавікоў, 242 тысячы легкавых аўтамабіляў, каля 18 тысяч аўтобусаў і не менш чым 22 мільёны халадзільнікаў. За гэты час было атрымана больш за 1,1 мільёна трактароў, прыкладна 19 мільёнаў тэлевізараў, амаль 22 тысячы камбайнаў, 23 мільёны тон пракату металаў і больш за 124 тысячы ліфтаў. Гэта толькі асноўныя таварныя групы, па якіх ажыццяўлялася вытворчасць. Унутранае спажыванне ў нас у краіне, на жаль, абмежавана, таму больш за 70 %, а ў асобныя гады 74—75 % мы пастаўлялі на экспарт», — прывёў папярэдняя вынікі першы намеснік міністра.

Акрамя таго, інавацыйная прадукцыя за мінулы год у аб'ёме вытворчасці склала 46,5 %. «Кожныя два гады ў нас цалкам змяняецца мадэльны шэраг выпрабленага прадпрыемствамі Міністэрства прамысловасці прадукту, — распавёў ён. — Летась у нас было 6,5 мільярда долараў экспарту. Гэта найлепшая лічба за апошнія 10 гадоў па сістэме Міністэрства прамысловасці. Пры гэтым экспарт навукаёмістай і высокатэхналагічнай прадукцыі склаў больш чым тры чвэрці ў агульным леташнім экспарце прадпрыемстваў Мінпрама».

Па выніках 2023 года доля прамысловасці ва ўнутраным валавым прадукце краіны склала 3,65 %. «Прадпрыемствы сістэмы Мінпрама ўносяць у развіццё краіны досыць значны ўклад», — падкрэсліў першы намеснік міністра.

## ЗА АФРЫКАНСКІМ РЫНКАМ — ЁМІСТАЯ ПЕРСПЕКТЫВА

Традыцыйна супрацоўніцтва Беларусі складвалася больш з краінамі постсавецкай прасторы і Еўрасаюза, аднак гэтым не абмяжоўвалася. Аляксандр Агароднікаў сказаў, што сёння наша краіна працуе па ўсіх кантынентах і па розных групах прамысловых тавараў.

Што датычыцца афрыканскага рынку, то на сёння ён найбольш прывабны для супрацоўніцтва, адзначыў першы намеснік міністра. «Мы разглядаем афрыканскія краіны як партнёраў. Яны разумеюць, што мы прапануем ім сапраўдныя партнёрскія адносіны, — сказаў ён. — Менавіта таму практычна з усімі краінамі Афрыкі ў нас складваюцца добрыя, даверлівыя адносіны».

У асноўным на афрыканскі рынак пастаўляецца сельскагаспадарчая тэхніка з арганізацыяй сэрвісу, пасляпродажнага абслугоўвання і навучаннем спецыялістаў. «Мы бачым, што за сельскагаспадарчай тэхнікай будзе падцягвацца і іншая наша прадукцыя», — падкрэсліў першы намеснік міністра.

## НАД ЧЫМ ПРАЦУЕ МАЗ

**Генеральны дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода Валерый ІВАНКОВІЧ** расказаў, што галоўныя мэты прадпрыемства сканцэнтраваны на двух глабальных напрамках — выпуск грузавой тэхнікі розных мадыфікацый і грузападымальнасці (цягачы, самазвалы, спецыяльныя шасі) і запатрабаванай пасажырскай тэхнікі.

Сёлета адзначаецца 30-годдзе Міністэрства прамысловасці, прыкладна на гэты ж час прыпадае перыяд развіцця пасажырскага транспарту. «30 гадоў таму ў нас не было ўласнага пасажырскага транспарту. На базе Мінскага аўтамабільнага завода ўзнік новы напрамак. Мы распрацавалі розныя мадэлі, мадыфікацыі на грузаі пасажыраперавозкі. Сёння ў нас ёсць і электробусы, і тралейбусы, і аўтобусы з газавым прыводам, якія працуюць на звадкаваным і на кампрыміраваным газе», — распавёў Валерый Іванковіч.

За тры дзясяткі гадоў МАЗ распрацаваў тры пакаленні аўтобусаў. «Наша ўніфікаваная інавацыйная платформа дазваляе вырашаць любыя задачы, якія неабходныя спажыўцу, для рынку пасажырскай тэхнікі», — падкрэсліў ён.

Было адзначана, што пры падтрымцы кіраўніка дзяржавы прадпрыемства рэалізоўвае інавацыйны праект рэканструкцыі аўтобуснага завода. «Рэалізацыя праекта дазволіць павялічыць магутнасць у два разы. Гэта значыць, мы будзем выпускаць да 3 тысяч адзінак пасажырскай тэхнікі розных мадыфікацый, ёмістасці, што забяспечыць яшчэ большую дыверсіфікацыю экспарту», — нагадаў генеральны дырэктар.

Сёння МАЗ рэалізуе стратэгію развіцця да 2030 года, якая мае на ўвазе пад сабой паэтапнае перааснашчэнне, набыццё новага інавацыйнага абсталявання. Па словах Валерыя Іванковіча, гэта дазволіць пашырыць мадэльны рад і задаволіць запыты спажыўцоў.

Гендырэктар прадпрыемства таксама распавёў аб развіцці супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі. Паводле яго слоў, найбольш актыўна адносіны пачалі развівацца ў апошнія гады. «У нас вялікія сувязі з Паўночнай Афрыкай. Мы пачыналі са зборачных вытворчасцяў. Важна, каб мы на роўных успрымалі гэтае супрацоўніцтва. У гэтым перспектыва нашага ўзаемадзеяння».

## «САМАСТОЙНЫЯ» КАР'ЕРНЫЯ ГРУЗАВІКІ І ЎЛАСНЫЯ «МАЗГІ»

Над аўтаномнымі аўтамабілямі «БЕЛАЗ» пачаў працаваць яшчэ ў 2013 годзе. Другое пакаленне такіх машын ужо знаходзіцца ў доследнай эксплуатацыі ў Расіі. А ў дадзены момант прадпрыемства вырашае пытанні імпартазамяшчэння электронных кампанентаў і праграмнага забеспячэння.

«Ужо з мінулага года на прадпрыемстве працуюць над атрыманнем доследных узораў імпартазамяшчальнай тэхнікі. Гэта датычыцца як сістэм кантролю і кіравання, а значыць, таго, што называецца жалезам, так і праграмнага забеспячэння, — распавёў журналістам **Сяргей ЛЕСІН, генеральны дырэктар ААТ «БЕЛАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ».**

Першую задачу ў холдынгу ўжо выканалі: машына прайшла прыёма-здатачныя выпрабаванні ў снежні мінулага года. Цяпер вырашаецца пытанне атрымання ўласнага праграмнага прадукту для кіравання ўсім гэтым комплексам. «Да канца года гэтая задача будзе вырашана. І мы ў наступным годзе плануем рэалізацыю самазвалаў з ужываннем беларускіх камплектуючых і софту», — заявіў Лесін. Таксама ён распавёў пра іншыя прыклады лічбавізацыі айчынных аўтамабіляў.

«З бягучага года кожны самазвал камплектуецца сістэмай, якая дазваляе з дапамогай мабільнай сувязі або індустрыяльнага Wi-Fi адсочваць работу кожнай адзінкі тэхнікі. Збіраецца больш за 200 параметраў работы вузлоў, і тут выкарыстоўваецца штучны інтэлект, які дазваляе выбудоўваць трэнды і даваць прадказанні ў частцы рэштакавага рэсурсу вузла, выяўляць анамаліі, што кажа аб яго аварыйнай рабоце.

Сяргей Лесін заявіў, што без стаўкі на лічбавізацыю заставацца канкурэнтаздольным складана, і гэта датычыцца не толькі магчымасцяў аўтамабіляў, але і саміх пытанняў вытворчасці. У якасці прыкладу ён прывёў цалкам рабатызаваны фарбавальны комплекс, які будзе запушчаны на прадпрыемстве ў наступным годзе.

Генеральны дырэктар адзначыў, што Расійская Федэрацыя з'яўляецца не толькі асноўным пакупніком беларускай кар'ернай тэхнікі, а і сапраўды магутнай пляцоўкай тэхналагічнай кааперацыі. Напрыклад, у дадзены момант на прадпрыемстве холдынга рэалізоўваецца праект мадэрнізацыі вытворчасці. Агульны аб'ём інвестыцый перавысіць 250 мільёнаў долараў.

Для БЕЛАЗа супрацоўніцтва з Расіяй забяспечвае больш за 90 % продажаў. Безумоўна, і расійскія партнёры разглядаюць нас як асноўнага пастаўшчыка кар'ернай тэхнікі.

А яшчэ холдынг прыцягвае сродкі крэдыту, выдадзенага РФ, у асноўным для мадэрнізацыі ўласных вытворчых магутнасцяў і павелічэння патэнцыяльнага аб'ёму вытворчасці тэхнікі. Магутнасці прадпрыемства пасля рэалізацыі гэтага праекта павінны вырасці на 20 %. Тэрмін заканчэння — 2025 год.

«Мы атрымалі сродкі на льготных умовах. Да канца 2025 года чакаецца паступленне не менш за 70 адзінак абсталявання, якое дазволіць нам не толькі павялічыць аб'ёмы вытворчасці нашай прадукцыі, але і павысіць яе тэхніка-эканамічныя паказчыкі. Акрамя таго, гэта дазволіць нам аптымізаваць сабекошт прадукцыі, што таксама станоўча адаб'ецца на цэнах, якія мы прапануем нашым кліентам у Расійскай Федэрацыі», — адзначыў гендырэктар.

Калі казаць пра сумеснае імпартазамяшчэнне, то Сяргей Лесін успомніў праект з магнітагорскім металургічным камбінатам і «Поўначсталлю» па замяшчэнні зносаўстойлівых ліставых сталей. «Нашы партнёры паступова нарошчваюць аб'ёмы, якія нам патрэбны, а адсутныя мы перакрываем з дружалюбных краін. Ужо ў наступным годзе, думаю, цалкам закрыем усе аб'ёмы. Акрамя таго, ёсць знакавы праект па стварэнні сумеснага прадпрыемства ў Пінску, якое ўжо выпускае прадукцыю — гэта аксіяльна-поршневыя помпы. Раней гэта была прадукцыя, якая выпускаецца ў краінах Заходняй Еўропы, а цяпер гэта сумесны прадукт з расійскай кампаніяй», — падзяліўся ён.

Таксама рэалізоўваецца два праекты з расійскімі вытворцамі па такіх складаных кампанентах, як рухавікі ўнутранага згарання. «Прадукты не самыя простыя да засваення, але мы рухаемся, доследныя ўзоры альбо ў стане зборкі выпрабаванняў на нашых палігонах, альбо ўжо ў палях у эксплуатацыі. Глядзім, як гэта ўсё працуе і якія трэба ўнесці карэктывы для павышэння надзейнасці тэхнікі».

## НА «ПЛАНАРЫ» РОСТ ПРОДАЖАЎ ЗА МЯЖУ — У РАЗЫ

Як распавёў **генеральны дырэктар ААТ «Планар» Сяргей АВАКАЎ,** экспарт прадукцыі на гэтым прадпрыемстве вырас амаль у два разы ў першым паўгоддзі 2024 года. «Мы выпрабляем абсталяванне, на якім іншыя прадпрыемствы вырабляюць інтэгральныя схемы. Наша прадпрыемства працуе цяпер практычна 24 на 7. У нас даволі моцна расце экспарт. У 2022 годзе ў адносінах да 2021-га тэмп росту экспарту склаў 212 %, у 2023 годзе ў адносінах да 2022-га — 201 %. Сёлета па выніках першага паўгоддзя тэмп росту экспарту склаў 197 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Каб падтрымліваць такі высокі тэмп росту экспарту, нам даводзіцца праводзіць пастаянныя распрацоўкі новых прадуктаў», — заявіў Сяргей Авакаў.

На прадпрыемстве вядзецца распрацоўка новага абсталявання па шасці праектах дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм, а таксама па дзевяці кааперацыйных праектах, якія фінансуе Расійская Федэрацыя. «Мы пастаянна абнаўляем сваё абсталяванне, робім яго больш інтэлектаёмістым, за кошт чаго павышаецца яго кошт», — падкрэсліў гендырэктар.

Дарэчы, развіццё «Планара» ўжо распісана да 2040 года ў адпаведнай праграме. «У ёй прадугледжаны цэлы шэраг кааперацыйных праектаў, у тым ліку досыць вялікіх. Мы выконваем два праекты па пашырэнні вытворчасці дакладнай механікі і оптыкі. Акрамя таго, працуем па ўсіх напрамках, звязаных з імпартазамяшчэннем. Хоць у нас і высокі ўзровень лакалізацыі — парадку 80 %, — але 20 % мы закупляем ў далёкім замежжы», — падзяліўся Сяргей Авакаў. Імпартазамяшчальныя праекты прадпрыемства датычацца асабліва чыстых матэрыялаў, лазернай тэхнікі.

Сяргей КУРКАЧ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Ірана заклікаў неадкладна спыніць варварства Ізраіля



Міжнародная супольнасць павінна неадкладна спыніць гвалт, забяспечыць пастаяннае спыненне агню ў Газе, а таксама спыніць жорсткасць Ізраіля ў Ліване. Аб гэтым заявіў прэзідэнт Ірана Масуд Пезешкіян падчас свайго выступлення на сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, паведаміла інфармагенцтва IRNA. Паводле яго слоў, за апошні год свет стаў сведкам таго, як Ізраіль «вытварае зверствы ў Газе». «За адзінаццаць месяцаў ён раўнадушна забіў больш за 41 тысячу нявінных людзей — у асноўным жанчын і дзяцей. Яго лідары называюць гэты генацыд, забойства дзяцей, ваенныя злачынствы і дзяржаўны тэрарызм «законнай самаабаронай», — сказаў Масуд Пезешкіян. — Мы падтрымліваем людзей па ўсім свеце, якія выйшлі на вуліцы, абураныя ізраільскімі зверствамі. Мы асуджаем злачынствы Ізраіля супраць чалавечнасці». Прэзідэнт Ірана падкрэсліў, што апошнія ізраільскія дзеянні ў Ліване, за якімі рушыла ўслед масіраваная агрэсія з тысячамі ахвяр, не могуць застацца без адказу: «Адказнасць за наступствы ляжа на тых, хто сарваў усе сусветныя намаганні па спыненні гэтай жахлівай катастрофы і мае нахабства называць сябе прыхільнікамі праўоў чалавека».

### Volkswagen можа скараціць больш за 15 тысяч работнікаў з-за закрыцця заводаў



Аб гэтым паведаміла агенцтва Bloomberg са спасылкай на фінансавую кампанію Jefferies. Адзначаецца, што Volkswagen разглядае магчымасць закрыцця двух-трох сваіх заводаў, пры гэтым для прыняцця адпаведнага рашэння аўтавытворцы не трэба мець адабрэнне назіральнага савета. Аналітыкі прагназуюць, што выдаткі на спыненне вытворчасці складуць да 4 мільярдаў еўра. Апошнім часам нямецкі вытворца змагаецца з высокімі выдаткамі і ўзмацненнем жорсткасці канкурэнцыі з боку Tesla і кітайскіх аўтавытворцаў на чале з BYD. Напярэдадні тысячы чалавек выйшлі на акцыю пратэсту ў Брусэлі супраць запланаванага закрыцця завода Audi і іншых аўтамабільных прадпрыемстваў у Бельгіі і іншых еўрапейскіх краінах.

### Асабістыя даныя 100 мільёнаў грамадзян ЗША трапілі ў адкрыты доступ



Гэта здарылася з-за халатнасці фірмы па праверцы анкетных даных, піша партал Cybernews са спасылкай на ўласнае даследаванне. Пра гэта паведаміла PIA «Новости». «Даследаванне партала паказала, што кампанія пакінула 2,2 тэрабайта асабістых даных без пароля, даступнымі каму заўгодна ў сетцы інтэрнэт. Тое, што, хутчэй за ўсё, было чалавечай памылкай, раскрыла 106,3 мільёна запісаў, якія змяшчаюць прыватныя звесткі аб грамадзянах ЗША», — адзначаецца ў матэрыяле. Як тлумачыць партал, у сетку трапілі імёны, даты нараджэння, адрасы пражывання, IP і скрыняў электроннай пошты, гісторыя працаўладкавання, нумары тэлефонаў і разнастайныя юрыдычныя дакументы. Cybernews заяўляе, што вынікі даследавання ставяць пад пытанне абароненасць асабістых даных жыхароў краіны.

Могилевский филиал
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(организатор аукциона)
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества**

## ОАО «Бумажная фабрика «Спартак»

(г. Шклов, ул. Фабричная, 26)

